НА БАРАЦЬБУ ЗА БУЛЬБУ

8—11 КАСТРЫЧНІКА—
усебеларускі трохдзеньнік уборкі і адгрузкі бульбы

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 274 (4180)
Чацьвер, 8 кастрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

БАЯВАЯ ЗАДАЧА—у вызначаныя тэрміны поўнасьцю ўбраць бульбу, МАКСЫМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ АДГРУЗКУ!

ТРОХДЗЕНЬНІК БАЯВЫХ ДЗЕЯНЬНЯУ

З 8-га па 11-га кастрычніка праводзіцца **УСЕБЕЛАРУСКІ ТРОХДЗЕНЬНІК КАПАНЬНЯ, УБОРКІ І АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ.**

Трохдзеньнік павінен зьвяціца баявой кампаніяй па мабілізацыі шырокіх мас працоўных вакол ударнага выкапаньня плянаў палявых работ на адным з адказьнейшых вучасткаў выкапаньня плянаў вывазу бульбы ў прамысловыя цэнтры Савецкага Саюзу.

МАСАВАСЬЦЬ—АСНОЎНАЯ ПРАДПАСЬЫЛКА ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ТРОХДЗЕНЬНІКА. Толькі на аснове шырокай растлумачальнай работы спрод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх адна-асобных мас, на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва можна дабіцца неабходных рэзультатаў. Увесь раённы партыйны, савецкі, камсамольскі і прафэсіянальны актыў павінен быць кінут у саўгасы, калгасы, вёскі, на арганізацыйна-масавую работу.

Усюды павінны быць арганізаваны **агульныя масавыя выхады** ўсяго працоўнага насельніцтва на палявыя работы.

КАРОТКІМ, КАНЦЭНТРАВАНЫМ УДАРАМ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ РАШАЮЧЫ ПЕРАЛОМ НА ФРОНЦЕ БАРАЦЬБЫ ЗА УБОРКУ І ВЫВАЗКУ БУЛЬБЫ —ТАКАВА ЗАДАЧА ТРОХДЗЕНЬНІКА. Для выкапаньня яе патрабуецца **максымум сіл, волі і энэргіі, выразнае кіраўніцтва, каардынацыя сіл, адзінства дзеяньняў.**

Сапраўдная **ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА**— важнейшы вагар узьняцьця прадукцыйнасьці працы, забесьпячэньня найбольшай эфэктыўнасьці ў работах. Гэта павінны цьвёрда запамятаць усе раённыя арганізацыі, кожны саўгас, калгас, МТС, кожны работнік, які прымае ўдзел у правядзеньні трохдзеньніка.

Баявыя тэмпы ўборкі неабходна цесна зьвязаць **З ВЫСОКАЙ ЯКАСЬЦЮ** работ, з задачай **поўнай выбаркі** бульбы з зямлі, з рашучай **барацьбой са стратамі.** Якасныя паказальнікі павінны стаць важнейшым аб'ектам спаборніцтва на ўборачных палёх.

Трохдзеньнік павінен прайсьці пад знакам **папулярызацыі апошняй пастановы ЦК КП(б)Б аб уборцы, загатоўцы і хаваньні бульбы і плодагародніны,** павінен паслужыць важнейшым этапам рашучай барацьбы за поўнае ажыцьцяўленьне гэтай пастановы.

Цэнтральны Камітэт прызнаў «становішча ўборкі плодагародніны і асабліва бульбы зусім нездавальняючым» і абавязкаў усе партарганізацыі «баявымі тэмпамі выканаць заданьні ў тэрмін». У пастанове выразна паказаны тыя практычныя мерапрыемствы, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечыць пасьпяховае выкананьне ўборкі і загатоўкі бульбы.

Буйныя гарады і рабочыя цэнтры павінны быць **прымацаваны** да пэўных раёнаў, адкуль непасрэдна павінна паступаць бульба. **Прыгарадныя гароды** прымацоўваюцца да асобных ЗРК, прадпрыемстваў і ўстаноў, прычым на апошнія ўскладзена **адказнасьць** за ўборку, вываз і рэалізацыю бульбы і плодагародніны.

Важнейшай задачай зьяўляецца своячасовае **транспартаваньне** бульбы і плодагародніны па хавальні і базы. На гэту справу павінен быць мабілізован у максымальных разьмерах аўтагужавы транспарт. Разгрузка бульбы і плодагародніны з вагонаў павінна праводзіцца на больш, як у **трохгадзінны тэрмін.**

Пастановай ЦК аднаведныя арганізацыі абавязаны прыняць рашучыя меры па рамонце і фарсаваным выробе **тары,** а таксама па пашырэньні сеткі **хавалень** бульбы і плодагародніны. Асабліва важным у гэтых адносінах зьяўляецца ажыцьцяўленьне дырэктывы аб заключэньні ЗРК і ПРК **ДАГАВАРОЎ З КАЛГАСАМІ НА ХАВАНЬНЕ ГАРОДНІНЫ.**

Гандлёвыя арганізацыі павінны пашырыць сетку магазынаў і ларкоў для **раздробнага продажу** плодагародніны, прычым падобнага роду ларкі неабходна ствараць для самастойнага гандлю **саўгасаў і калгасаў.**

Сярод практычных задач, зьвязаных з рэалізацыяй плодагароднага ўраджаю, важнейшае месца займае **АДГРУЗКА БУЛЬБЫ Ў ЛЕНІНГРАД.**

ЦК КП(б)Б падкрэсьліў у сваёй пастанове, што адгрузка разгортваецца «асабліва нездавальняючымі тэмпамі» ў той час, як «гэта работа зьяўляецца баявой задачай усёй партыйнай арганізацыі, усіх савецкіх і каапэрацыйных арганізацый». Гэта ўказаньне Цэнтральнага Камітэту павінна забясьпечыць самыя рашучыя зрухі ў выкапаньні плянаў адгрузкі, забясьпечыць адпраўку **ня менш 400 вагонаў у дзень** і скончыць адгрузку **не пазьней 1-га лістапада.**

Трохдзеньнік павінен паслужыць сродкам для мабілізацыі мас па выкапаньне ўсіх практычных задач, пастаўленых ЦК у сваёй пастанове.

Фронт уборачнай кампаніі — фронт клясавай барацьбы. Кулак прымае ўсе меры, каб затармазіць баявыя тэмпы ходу палявых работ, каб атрутай сваёй агітацыі надарваць зьдзельшчыну, дэзарганізаваць калгасную вытворчасьць.

Мабілізацыяй шырокіх мас працоўных па баявое правядзеньне ў жыцьцё бягучых задач партыі, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва, укараненьнем зьдзельшчыны, барацьбой з абязьлічкай — забясьпечым ударнае выкапаньне ўборкі і загатоўкі плодагародніны, панясем гэтым кулаку і яго агентуры — апартуністам — новы руйнуючы ўдар.

Трохдзеньнік — баявы экзамэн на **ГІБКАСЬЦЬ** у рабоце, на ўменьне паставіць на ногі **ўсю** савецкую грамадзкасьць на хуткае **пераключэньне ўсіх сіл на ўдарныя вучасткі** нашага будаўніцтва. Гэты экзамэн павінен быць вытрыман па-бальшавіцку!



Бульбакапалка ў дзеяньні

Штурм прарываў па капаньні бульбы

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Тэмпы ўборкі бульбы па раёне яшчэ слабыя. УСЯГО УБРАНА 22 ПРОЦ. ЗАСЕЯНАЙ ПЛОШЧЫ.

Бюро райкому КП(б)Б абвясьціла штурм па ліквідацыі прарываў ва ўборцы бульбы. Усе ўстановы і арганізацыі мабілізаваліся на дапамогу сельсаветам, калгасам і саўгасам у правядзеньні ўборкі.

РЫМАРНАЯ ФАБРЫКА НАКІРАВАЛА ў падшэфны Бракаўскі сельсавет рабочую брыгаду ў ліку 100 чалавек. ПЭДІНСТЫТУТ паслаў на ўборку 400 чалавек, ФЗВ ЧЫГУНАЧНІКАЎ—100 чалавек, ЗЯМЕЛЬНЫ ТЭХНІКУМ—100 чалавек і МЭДТЭХНІКУМ—150 чалавек. Большасьць брыгад будзе працаваць на ўборцы 12-15 дзён.

Раённая газэта «КАМУНАР МАГІЛЕЎШЧЫНЫ» мабілізавала на ўдарнае правядзеньне ўборкі бульбы ўсіх сваіх рабселькораў.

УЛ. МАРСКІ.

„Спачатку выкапаем бульбу са сваіх гародаў"

КРУПКІ.

Большасьць калгасаў Крупскага раёну яшчэ не прыступіла да ўборкі бульбы. У некаторых калгасах існуюць спажывецкія настроі. Так, старшыня калгасу **«ЧЫРВОНЫ ПАХАР» Устругін** заяўляе:

— Мы спачатку выкапаем бульбу са сваіх гародаў, а потым выйдзем на калгаснае поле.

У тых калгасах, дзе ўборка разгорнута, яна праходзіць самацёкам, без належнага кіраўніцтва з боку райкалгасаюзу і праўленьняў калгасаў. Рабочыя пляны ў большасьці калгасаў не прапрацаваны.

Трэба зараз-жа прыняць меры да ўзмацненьня ўборкі бульбы ў калгасах. Часу да скончэньня тэрміну ўборкі засталося мала.

А. Вясковы.

Уборка праходзіць арганізавана

ВУЗДА.

Калгаснікі і аднаасобнікі **С.-Пырашаўскага** сельсавету па-ўдарнаму ўключыліся ва ўборку бульбы. Пытаньне аб уборцы было своячасова прапрацавана партыйнымі ячэйкамі, сельсаветам і на агульных сходах калгаснікаў і аднаасобнікаў. Пастаноўлена скончыць уборку бульбы не пазьней 10 кастрычніка.

Ужо зараз можна сказаць, што С.-Пырашаўскі сельсавет пасьпяхова і ў вызначаны тэрмін скончыць уборку, бо апошняя праходзіць сапраўды па-баявому і арганізавана.

Махнач.

Студэнты мабілізаваліся на ўдарнае правядзеньне ўборкі

Агульны сход студэнтаў **Менскага архітэктурна-дарожна-будаўнічага і вячэрняга рабочага** тэхнікумаў заслухаў інфармацыю чырвонасьцяжніка і чырвонага партызана тав. **Зайкоўскага** аб удзеле былых чырвоных партызан і гвардзейцаў Менску ва ўборцы бульбы. Сход пастанавіў поўнасьцю мабілізаваць на дапамогу калгасам і саўгасам у правядзеньні ўборкі.

Студэнты ўключаюцца ў штурмавыя атрады былых чырвоных партызан і гвардзейцаў па ліквідацыі прарываў ва ўборцы.

Сход выклікаў пасьледраць свайму прыкладу ўсе навучальныя ўстановы Менску.

Па-ўдарнаму разгарнулі капаньне бульбы

КЛІЧАЎ.

Калгас **«Чырвоны Маяк»** абвясьціў сябе мабілізаваным на своячасовае скончаньне ўборкі бульбы і зяблевага ворыва.

Калгас паставіў задачу—да «Дня ўраджаю і калектывізацыі»—14-га кастрычніка—дабіцца, каб ні адзін гэктар зямлі не застаўся няўзьнятым пад зяблева і ні адзін гэктар бульбы—няўбраным.

Усе калгаснікі разьбіты на брыгады, кожная брыгадзе вызначан пэўны вучастак. Устаноўленыя нормы выпрацоўкі, разгорнута сацспаборніцтва.

Селькор Рубашын.

Толькі 16 проц. пляну

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.).

Па Смалявіцкім раёне павінна быць убрана 2.157 гэкт. бульбы. На 5 кастрычніка ўбрана ўсяго 358 гэкт., што складае 16 проц. пляну.

Тэмпы ўборкі ў большасьці калгасаў нездавальняючыя. Належнага кіраўніцтва ўборачнай кампаніяй з боку раённых арганізацый, у прыватнасьці райкалгассаюзу—няма.

С.

ТЭЛЕГРАМА ЦК КП(б)Б, СНК БССР І ЦСПСБ

Усім райкомам і гаркомам КП(б)Б, райвыканкомам і райпрафсаветам

Прызнаючы тэмпы ўборкі і адгрузкі бульбы зусім нездавальняючымі, ЦК пастанавіў з 8-га да 11 кастрычніка арганізаваць Усебеларускі трохдзеньнік капаньня і адгрузкі бульбы.

Правядзеце масавую працу па калгасах, саўгасах, вёсках, мястэчках і гарадох па агульным выхадзе працоўнага насельніцтва з транспартам на капаньне, вывазку, адгрузку і буртаваньне бульбы.

Камандыруйце ўвесь партыйны, савецкі, камсамольскі і прафсаюзны актыў у сельсаветы, калгасы, саўгасы і паселішчы на арганізацыю трохдзеньніка.

Уборку бульбы ў калгасах і саўгасах перавядзеце выключна на зьдзельшчыну. Нападзьце штодзённае выкананьне норм, адначасова дабейцеся якасьці ўборкі. Лічэце баявой задачай скончэньне ўборкі і адгрузкі бульбы ў вызначаныя тэрміны.

Сакратар ЦК КП(б)Б—**ШАРАНГОВІЧ.**
Старшыня СНК БССР—**ГАЛАДЗЕД.**
Старшыня ЦСПСБ—**РЫЖОУ.**



Вывазка бульбы з поля

40 проц. апарату устаноў—на ўборку бульбы!

(З пастановы Менскага гарадзкога савету прафсаюзаў)

Прэзыдыум Менскага гарадзкога савету прафсаюзаў адзначыў, што да гэтага часу яшчэ няма належнага пералому ва ўборцы бульбы ў калгасах і асабліва ў саўгасах.

Адначасова прэзыдыум канстатаваў наяўнасьць апартуністычных адносін з боку паасобных устаноў і прадпрыемстваў да справы аказаньня прац. дапамогі саўгасам і калгасам у правядзеньні ўборкі.

Ня гледзячы на пастанову гаркому КП(б)Б, гарсавету і гарпрафсавету аб пасылцы 40 проц. апарату ўстаноў на дапамогу па ўборцы бульбы, ёсьць арганізацыі, якія яшчэ нічога не зрабілі ў гэтым напрамку (БЕЛПРАМСАЮЗ, НАРКАМЗЕМ, БЕЛДЗЯРЖСНАБ, БЕЛКАМУНБАНК, БЕЛСЕЛЬБУД, ЗАПАЛКАВАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ І ІНШ.).

Некаторыя арганізацыі (МЦРК, Наркампрацы), усё яшчэ самастойна пасылаюць рабочую сілу бяз ведама гарпрафсавету, чым тармозяць рэгулявань-не пасылкі рабочай сілы ў сапраўды патрэбныя пункты.

Значна аслабілі пасылку рабочых на дапамогу калгасам і саўгасам, некаторыя прадпрыемствы (заводы «ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫК», ІМЯ ВАРАШЫЛАВА, Ф-КА 8-ГА САКАВІКА і інш.).

Прэзыдыум Менгарпрафсавету абвязаў мясцкомы і кіраўнікоў устаноў неадкладна выканаць дырэктыву аб пасылцы 40 проц. работнікаў апарату для ліквідацыі прарываў ва ўборцы бульбы, паведаміўшы МГСПС не пазьней 9-га кастрычніка аб колькасьці выпучаных людзей.

СТАРШЫНЯМ МЯСЦКОМАЎ БЕЛПРАМСАЮЗУ, НК ЗЯМЛЯРОБСТВА, ЧЫРВОНАГА ХРЫЖУ, НАРКАМПРАЦЫ, МЦРК, ГАРСАВЕТУ АБВЕШЧАНА ВЫМОВА.

Прэзыдыум МГСПС зьвярнуўся ў гарКК-РСІ з просьбай разгледзець пытаньне аб кіраўнікох устаноў, якія аказваюць супраціўленьне ў пасылцы 40 проц. работнікаў апарату на ўборку бульбы.

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН

ІЛЬНАСАЛОМУ І ТРАСТУ—ІЛЬНАЗАВОДАМ

КАСТРЫЧНІК—РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ ЗАГАТОВАК ТРАСТЫ І САЛОМЫ

ПЛЯНЫ—ДА КОЖНАГА ІЛЬНАВОДЧАГА КАЛГАСУ І ПАСЕЛІШЧА

НЕ АДКЛАДВАЦЬ ПРЫЁМКУ

Эканамічны Савет БССР сваёй пастановай ад 21 верасьня г. г. абавязаў «загатоўчыя арганізацыі, незалежна ад тэрмінаў скончэньня будаўніцтва заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і капанель, забясьпечыць прыёмку трасты і саломы ад кантрактантаў у разьмеры, устаноўленым дагаворамі, а заводам прымаць ад каапэрацыі трасту і салому па ўстаноўленых цэнах і нормах».

Раённым выканаўчым камітэтам прапанавана прасачыць за выкананьнем гэтай пастановы. Белільнапеньканцтрэст абавязан падрыхтаваць ільназаводы для прыёмкі трасты і саломы. **Загатоўка ільнатрасты і саломы павінна быць праведзена ў кастрычніку.**

Карэспандэнцы з месц сьведчаць, што ў радзе раёнаў да прыёмкі трасты не падрыхтаваліся. На Бігосаўскім ільназаводзе, пабудова якога ў асноўным скончана, да загатоўкі трасты не прыступаюць, спасылаючыся на адсутнасьць вагі, стандарту сырцу і г. д. Лепельскі завод усе сілы накіраваў на скончэньне канторы, пакінуўшы ў баку пабудову шохаў для складкі ільну.

Гэта паказвае, што кіраўнікі ільназаводаў, загатоўчыя і кіруючыя арганізацыі некаторых раёнаў не ўяшлі ўсёй важнасьці своячасовага правядзеньня гэтай работы.

Забясьпечваючы хутчэйшае скончэньне пабудовы ільназаводаў, ні ў якім разе нельга адкладваць загатоўку трасты і ільнасаломы.

Эканамічны Савет БССР «у выключных выпадках дічыць магчымым на мясцох часовае накіданьне трасты ў калгасах з поўнай гарантыяй захаваньня».

У аднаведнасьці з гэтым указаньнем полацкая куставая нарада работнікаў ільназагадаў і намеціла правільныя мерапрыемствы па скончэньні загатовак трасты і саломы ў кастрычніку, ня гледзячы на ступень скончэньня пабудовы ільназаводаў.

Белільнапеньканцтрэст у бліжэйшыя дні павінен забясьпечыць ільназаводы інвэнтаром, неабходным для загатоўкі трасты і саломы. Стандарты сырцу павінны быць пасланы ў ніз неадкладна. Ільназаводам неабходна даць прадукцыю высокай якасьці.

Каляндарныя пляны загатоўкі трасты і саломы райкалгассаюзы і райкапсаюзы павінны неадкладна давесьці да кожнага калгасу і паселішча.

Выразная арганізацыя загатовак трасты і ільнасаломы павінна забясьпечыць своячасовае выкананьне пастановы Эканамічнага Савету БССР.

Загатоўкі скончыць у кастрычніку

ПОЛАЦАК. У Полацку адбылася міжраённая нарада працаўнікоў ільназаводаў. На нарадзе абмяркоўвалася пытаньне аб загатоўцы заводамі ільнатрасты.

Нарада пастанавіла скончыць загатоўку трасты на працягу кастрычніка. У сувязі з гэтым, дырэктарам ільназаводаў прапанавана ў найкарацейшы тэрмін скончыць пабудову шохаў і забясьпечыць прыёмку трасты аднаведнымі кадрамі.

У выпадку, калі шохі па якой-небудзь прычыне ў тэрмін ня будуць скончаны, нарада лічыць неабходным загатоўленую трасту пакідаць у буйных калгасах пад расьпіскі аб захаваньні.

Адзначана, што Белільнапеньканцтрэст несваячасова дасылае сродкі на загатоўку і дагэтуль не распрацаваў стандартаў сырцу. У калгасах адсутнічаюць пляны загатовак.

Нарада высунула прапанову: безадкладна спусьціць пляны загатоўкі трасты да кожнага ільнаводчага калгасу і паселішча, вызначыўшы ня толькі колькасьць, але і якасьць трасты, якая падлягае здачы на ільназаводы.

Іваноў П.

Бігаў „ня ведае", як загатаўляць трасту

ДРЫСА. Пабудова **Бігосаўскага** ільназаводу ў асноўным скончана. Толькі малатаж не пачынаецца з прычыны таго, што няма машын. Неабходна прыняць усе меры да таго, каб Бігосаўскі завод быў пушчаны у тэрмін — 1-га лістапада.

Зараз асноўная задача заводу — загатоўка трасты. Прыёмка трасты не пачата.

Дырэктар заводу тав. Бігаў спасылаецца на адсутнасьць вагі, стандартаў трасты і заяўляе, што ён паогул ня ведае, як загатаўляць трасту.

Між тым, у саўгасе **Бігосава** ільнасалома з 650 гэктараў дагэтуль ня здана ільназаводу.

Дырэкцыя заводу абавязана заразжа шырока разгарнуць загатоўку трасты з тэмкім разьлікам, каб у кастрычніку яе закончыць.

А. Грэчкін.

Двухмесячнік праверкі рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб жывёлагадоўлі

БОЛЬШ УВАГІ САЛОМЕ І ГЛІНЕ

ПОЎНАСЬЦЮ СКАРЫСТАЦЬ МЯСЦОВЫЯ РЭСУРСЫ НА БУДАЎНІЦТВЕ СЬВІНАРНІКАЎ І АБОР

У саўгасе „Апчак" чакаюць саломы з... Менску

У саўгасе **«ГОРКІ-АПЧАК»** у гэтым годзе павінна быць пабудавана 19 сьвінарнікаў і дом для жыльля. На сёньняшні дзень у асноўным закончаны 4 сьвінарнікі. У 9-ці сьвінарніках ідзе кладка сьцен, рэшта яшчэ не пачата. Будаўніцтва не забясьпечана патрэбнай колькасьцю матар'ялаў.

Дырэктар саўгасу тав. **Кудзелінскі** разважае:

«Будаўніцтва, гэта справа Бельсельбуду, мы будзем прымаць, тады будзем гаварыць»...

Для пакрыцьця сьвінарнікаў у саўгасе няма дахавага матар'ялу. **А аб загатоўцы саломы ні будаўнічы вучастак, ні саўгас не падумалі і ніякіх крокаў ня ўжылі. Дырэкцыя саўгасу чакае пакуль нехта прывязе салому з... Менску.**

Дырэктар саўгасу і прараб займаюцца толькі спрэчкамі.

На сходзе рабочых будаўнікоў пры абмеркаваньні пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, прараб тав. **Гайкін** заявіў:

«У нас разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва нельга, бо для гэтага няма базы, няма ўмоў, спаборніцтва развіваюць там, дзе ўсё добра наладжана, у нас-жа не хапае лесаматар'ялаў і рабочыя мала кваліфікаваныя».

Пасьля такой яўна апартуністычнай заявы прараба становяцца зусім яснымі прычыны нікуды ня вартых тэмпаў на будоўлях у саўгасе **«Апчак»** і ніякая якасьць самога будаўніцтва.

Прараб плянуецца ў хвасьце адсталых рабочых.

Леановіч.

Рабочую сілу перакідваюць на другараднае будаўніцтва

ЗАСЛАЎЕ. Дырэктыва партыі і ўраду аб перакідцы рабочай сілы з другараднага будаўніцтва на будаўніцтвы сьвінарнікаў і абор дырэктарамі саўгасаў **«Беларусь»** і **«Зара Захаду»** злосна ігнаруецца.

Так, дырэктар саўгасу «Беларусь» тав. Жыўнеўская зьняла з будаўніцтва сьвінарніка брыгаду з 7 чал. і паслала яе на будаўніцтва дамоў. Дырэктар саўгасу **«Зара Захаду»** тав. Гарбуз паставіў 8 чал. на будаўніцтва сталоўкі ў той час, калі з распачатых 15 сьвінарнікаў па саўгасах пабудаваны толькі 3. Рэшта—8 пабудаваны на 85%, а 4—на 50%.

Галоўнай прычынай такога маруднага будаўніцтва зьяўляецца адсутнасьць арганізаванага набору рабочай сілы і несваячасовая дастаўка лесаматар'ялаў.

Партыйныя ячэйкі, рабкомы і дырэкцыі саўгасаў, разгарнуўшы работу па вярбоўцы рабочай сілы, павінны паскорыць тэмпы будаўніцтва сьвінарнікаў.

175.000 ТОН БУЛЬБЫ—ЛЕНІНГРАДУ

АДГРУЖАЦЬ НЯ МЕНШ 400 ВАГОНАЎ У ДЗЕНЬ

ЦК КП(б)Б дэ зусім выразную дырэктыву ўсім раённым арганізацыям аб неадкладным фарсаваньні адгрузкі бульбы Ленінграду. У сваёй апошняй пастанове аб уборцы, загатоўцы і хаваньні бульбы і плодагародніны ЦК прапанаваў райкомам «МАКСЫМАЛЬНА ФАРСАВАЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ДЛЯ ЛЕНІНГРАДУ З ТЫМ, КАБ ПА БССР АДПРАЎЛЯЦЬ НЯ МЕНШ 400 ВАГОНАЎ У ДЗЕНЬ, ПАДПАРАДКАВАЎШЫ МЯСЦОВЫЯ ЗАПАТРАБАВАНЬНІ ГЭТАЙ ЗАДАЧЫ».

Апошнія даныя Наркамснабу аб ходзе адгрузкі бульбы Ленінграду паказваюць, што дырэктыва ЦК выконваецца НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

НА 6 КАСТРЫЧНІКА ЛЕНІНГРАДУ АДГРУЖАНА ЎСЯГО 15.089 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 8 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Замест 400 вагонаў у дзень адгружаецца ўсяго 20-30 вагонаў.

Сыстэмы Белкавапсаюзу, Белсэдсаюзу, Белхлебжывёлсаюзу, Белільнасаюзу і Белпладагародніны да гэтага часу не мабілізавалі ўвагу шырокіх мас калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў вакол загатовак і адгрузкі гародніны. У радзе месц выкапаная бульба застраёвае на полі і ніхто не клапоціцца аб своячасовай вывазцы яе на чыгуначную станцыю.

Чыгунка не забясьпечыла нармальную пастаўку вагонаў для адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам. На радзе станцый бульба доўгі час пляжыць бяз руху, чакаючы вагонаў. Так, з ГЛУСКАГА раёну тэлеграфуюць: «АДГРУЖАНА ЗА ПЯЦІДНЕЎКУ 580 ТОН БУЛЬБЫ. ВАГОНАЎ НЕ ПАДАЮЦЬ. НА СТ. РАТМІРАВІЧЫ ЛЯЖЫЦЬ 15 ВАГОНАЎ БУЛЬБЫ».

Такія-ж паведамленьні паступаюць са СЛУЦКАГА і іншых раёнаў. Гэтыя ненармальнасьці неабходна канчаткова ліквідаваць. Трэба дабіцца бесьперабойнай адгрузкі загатоўленай бульбы Ленінграду, забесьпячэньня рэгулярнай падачы паражняка.

Загатоўчыя сыстэмы абавязаны неадкладна фарсаваць адгрузку бульбы, поўнасьцю выканаць каляндарныя пляны вывазкі бульбы на станцыі.

Адгружаць ня менш 400 вагонаў у дзень — такава баявая задача ўсіх загатоўчых арганізацый БССР.

Уборка бульбы ў саўгасе НДУ

ЗЯБЛІВА

Ворыва— на зьдзельшчыну

Забясьпечыць будучы ўраджай ільну

Патроіць тэмпы зяблева

ШКЛОЎ. (Наш кар.).

Зяблевае ворыва ў раёне разгортваецца зусім **невыстарчальнымі** тэмпамі. Асабліва адстае аднаасобны сэктар.

Калгасы з пляну ў 15.000 гэкт. узьнялі пад зяблева 3.788 гэкт. — 22,6 проц., аднаасобнікі з 14.000 гэкт. узьнялі толькі 1.480 гэкт. — 10 проц.

МТС, якая павінна была быць упераздзе, выканала плян зяблева **ўсяго на 19,3 проц.**

Пры такіх тэмпах важнейшая гаспадарча-палітычная кампанія, якая адыгравае надавычай вялікае значэньне ў **справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня і ўзьняцьця ўраджайнасьці** ставіцца пад яўную пагрозу зрыву.

Гэта патрабуе ад райкалгассаюзу, райза і МТС прыняць усе меры для поўнага выкананьня плянаў як калгасамі, так і аднаасобнікамі.

Гэтыя органы павінны памятаць, што ў 1932 г. у **Шклоўскім** раёне павінна быць засеяна **ільном 18 проц.** усёй пасеўплошчы.

НОВІК.

Пляны зяблева марынаваліся ў папках райза

РАГАЧОЎ. Згодна пляну НКЗБ **Рагачоўскаму** раёну неабходна ўзьняць пад зяблева 26.000 гэкт.

На 1 кастрычніка гэты плян выканан усяго на 4,4 проц. Саўгасы лепш арганізавалі справу і выканалі плян зяблева на 39,2 проц.

Калгасы-ж выканалі плян на 5,9 проц., аднаасобнікі яшчэ горш — на 2,3 проц.

Ганебным тэмпам зяблева спрыяла бязьдзейнасьць раённых арганізацый. Да 1 кастрычніка пляны зяблева марынаваліся ў габінэтах райза і райкалгассаюзу. І толькі з гэтага часу пачалі рассылаць іх па сельсаветах і калгасах. У выніку гэтага ў некаторых сельсаветах, напрыклад, у **Сьвяціцкім,** за зяблева нават і ня браліся. Таксама не пачыналі зяблева калгасы: імя **Сьвярдлова, «Свабода», «Пераможца»** і інш.

Я. САВІЦКІ.

Падрыхтаваць шохі

ЛЕПЕЛЬ. У будаўніцтве Лепельскага ільназаводу ўсё яшчэ няма належнага эруху. Сыгналы цэнтральнага і раённага друку прайшлі міма ўвагі будаўнікоў заводу.

Зараз завод павінен разгарнуць работу па загатоўцы трасты, а шохі не падрыхтаваны. У першую чаргу крыюцца памяшканьні для канторы, а шохі стаяць бяз страхаў.

Завод ня ведае, які калгас і колькі павінен здаць трасты. Райкалгассаюз і райкапсаюз не прынялі мер, каб своячасова давесьці пляны да здатчыкаў ільнатрасты.

Арганізацыя мяльна-сушыльных пунктаў па-ранейшаму ідзе дрэнна.

ПАПРАУКА

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ў тэлеграме ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб загатоўках насельніцтва кармовых траў, каранеплодаў і гародных культур скажон па віне супрацоўніка рэдакцыі адзін з подпісаў:

Трэба чытаць: **«САКРАТАР ЦК КП(б)Б — ШАРАНГОВІЧ; СТАРШЫНЯ СНК БССР — ГАЛАДЗЕД».**

Аршанскія чыгуначнікі ўключыліся ў «сталінскую эстафэту»

ПРАВЕРКАЙ ВЫКАНАНЬНЯ УКАЗАНЬНЯЎ т. СТАЛІНА АХАПІЦЬ УСЕ ЧЫГУНАЧНЫЯ ВУЗЛЫ БССР

Чыгуначнікі Аршанскага вузла падхапілі ініцыятыву рабочых мас Масквы аб арганізацыі «Сталінскай эстафэты» ў адзнаку гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі шырока разгарнулі работу **па праверцы выканаўня 6-ці ўмоў тав. Сталіна.**

5-га кастрычніка партыйны, камсамольскі, прафэсіянальны і гаспадарчы актыў вузла прыняў адозву да ўсіх чыгуначных арганізацый БССР аб спаборніцтве па лепшае правядзеньне падрыхтоўкі да кастрычніцкіх сьвят і чарговага пленуму ЦК.

Актыў узяў на сябе канкрэтныя абавязкі па ліквідацыі недахопаў у рабоце вузла. Актыў абавязаўся павялічыць сярэдня-сутачную работу паравозаў і вагонаў мінімум на адну гадзіну, зьнізіць норму прастоя вагонаў па грузавых і транзытных апэрацыях на 5 проц., зьнізіць процант хворых паравозаў на 1 проц., павялічыць каэфіцыэнт маневровай работы ня менш як на 2 адзінкі і г. д.

Ударныя брыгады дэпо, паравозаў, кандуктарскія, камсамольскія брыгады і работнікаў станцыі высоўваюць сустрэчныя самаабавязацельствы ў падарунак чарговаму пленуму ЦК КП(б)Б і кастрычніцкім сьвятам.

Паравозныя брыгады ўдарных пасажырскіх паравозаў узялі на сябе абавязацельства да пленуму ЦК КП(б)Б электрыфікаваць 10 паравозаў. Камсамольцы арганізавалі 13 брыгад з 90 добраахвотнікаў для ўдзелу ў маршрутах «Сталінскай эстафэты».

Камсамольскі калектыў цягі абавязаўся арганізаваць 3 ударных камсамольскіх брыгады, з якіх 2 па выпадковым рамонце паравозаў і адзін па абточцы, адрамантаваць звыш пляну ў падарунак пленуму ЦК КП(б)Б і 14-ай гадавіне Кастрычніка паравоз, учэпіць у рады камсамолу 19 маладых рабочых, сабраць 50 рацыяналізатарскіх прапаноў і прасачыць за іх рэалізацыяй і г. д.

Аршанскі чыгуначны вузел ідзе першым кандыдатам на МББ чыгунцы на Усесаюзным конкурсе па выкананьні галоўных вымяральнікаў трансфіпляну.

Выяўлены лепшыя брыгады дэпо па рамонце паравозаў, якія на працягу 5 месяцаў выконваюць і перавыконваюць трансфіпляны. Вось яны: брыгада аўтаматчыкаў, пад кіраўніцтвам брыгадзіра-ўдарніка-вынаходцы тав. **Лысіновіча,** у маі выканала сустрэчны трансфіпляны на 100 проц., у чэрвені на 167 проц., у ліпені на 169 проц., у жніўні на 172 проц. і ў верасьні на 169 проц.

Поршневая брыгада пад кіраўніцтвам ударніка-вынаходцы тав. **Лугаўцова** ў маі выканала трансфіпляны на 105 проц., у чэрвені на 116 проц., у ліпені на 149 проц., у жніўні на 159 проц. і ў верасьні на 158 проц.

Дышлевая брыгада пад кіраўніцтвам ударніка тав. **Вялічкі** выканала трансфіпляны у маі на 145 проц., у чэрвені—105 проц., у ліпені192 проц., у жніўні на 119 проц. і ў верасьні—172 проц.

Узорныя прыклады работы паказала брыгада арматурчыкаў пад кіраўніцтвам ударніка тав. **Жука.** Арматурчыкі ў маі выканалі трансфіпляны на 120 проц., у чэрвені на 137 проц., у ліпені — 209 проц., у жніўні—157 проц. і ў верасьні—194 проц.

Лепшымі пасажырскімі машыністамі журы дэпо прызнаны выстаўленыя на ўсесаюзны конкурс т. т. **Мікуловіч Сьц., Янкулеў і Чуприн,** якія на працягу апошніх 5 месяцаў перавыконваюць даныя вымяральнікі, ня мелі ні хвіліны спазьненьня цягніку, ніводнага зрыву спаранай язды, прагулу і спазьненьня на працу.

Энтузіясты электрыфікацыі паравозаў паравозьнікі т. т. **Мікуловіч Сьц., Раткевіч, Славуцкі, Багданаў, Смыкаў, Дайнэка, Мікуловіч Ів., Любецкі В., Кошкін, Герасіменка, Кардоўскі** і рабкор **Пракаповіч** у выкананьні ўзятых на сябе самаабавязацельстваў на працягу 3 і 4 кастрычніка электрыфікавалі 5 паравозаў у падарунак надыходзячаму кастрычніцкаму пленуму ЦК КП(б)Б.

Зараз па Аршанскім раёне курсуюць з электрычным сьвятлом ударныя паравозы імя «Зьвязды», «Рабселькора», Кліма Варашылава і паравозы №№ 98-73 і 98-79.

Уся работа па электрыфікацыі паравозаў праведзена дармова, матар'ял здабыт паказанымі таварышамі ў парадку мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Неабходна адзначыць узорную работу рабкора-ўдарніка «Зьвязды» тав. **Пракаповіча,** які фактычна зьяўляецца арганізатарам і практычна дапамагае электрыфікаваць паравозна-пасажырскі парк Аршанскага дэпо.

У кіраўніцтве 3 раёну на справу электрыфікацыі паравозаў есьць 10.250 рубл., якія ляжаць мёртвым капіталам. З гэтага фонду ніводная капейка ня была выдаткавана на электрыфікацыю паравозаў.

На шляху ініцыятывы энтузіястаў электрыфікацыі было многа перашкод. Напрыклад: манцёр **Сонцаў,** які паміж ім быў дапамагчы асьвятліць электрычнасьцю паравоз імя Кліма Варашылава, на работу зусім не зьявіўся, а старшы манцёр **Дзьмітрыеў** патрабаваў спэцвопратку, новых частак і г. д. 4 кастрычніка зусім ніхто не зьявіўся і паравозьнікі ўсю работу праводзілі самі, а рабкор **Пракаповіч** выконваў абавязкі электраманцёра.

Партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя і гаспадарчыя арганізацыі чыгуначнага транспарту БССР, павінны на прыкладзе чыгуначнікаў Аршавічыны беззадкладна ўключыцца ва ўсесаюзную «Сталінскую эстафэту».

Треба праверыць, як чыгуначныя вузлы БССР на справе рэалізуюць паказаньні тав. Сталіна ў сваёй практычнай штодзённай рабоце.

Вакол «Сталінскай эстафэты» і барацьбы за выкананьне і перавыкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак і трансфіпляну 4 кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі, павінны быць мабілізаваны рабочыя масы ўсіх чыгуначных вузлоў БССР.

Ударная брыгада «Зьвязды» і «Чырвонай Зьмены»:
Гафт, Славуцкі, Багданаў, Пракаповіч, Сураў, Віялкін, Малей, Галюўскі, Талан.

ДЭПО ВІЦЕБСК. Лепшы ўдарнік такарнага цэху дэпо тав. АЛЕКСАНДРОВІЧ

Партыйнае будаўніцтва

ЖЛОБІНСКАЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКА СЛУЖБЫ ЦЯГІ

ПРАЗ НОВЫЯ ФОРМЫ РАБОТЫ

дабілася посьпехаў у выкананьні вымяральнікаў

КАМУНІСТЫ-ЧЫГУНАЧНІКІ АБАВЯЗАНЫ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПОСЬПЕХ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

Баявая пастаноўка партработы—

АСНОЎНАЯ УМОВА ПАСЬПЯХОВАГА ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК

Рэалізацыя ўказаньняў тав. Сталіна, правядзеньне ў жыцьцё важнейшых пастаноў партыі і ўраду аб чарговых задачах прамысловасьці і сельскай гаспадаркі стварылі ўсе ўмовы для таго, каб да канца бягучага году ня толькі выканаць прамфінплян чацьвертага кварталу, але і ліквідаваць тую запазычанасьць, якая мае месца на некаторых вучастках прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтай адказнейшай задачы ў значнай ступені залежыць ад выразнасьці і бесьперабойнасьці ў рабоце чыгуначнага транспарту.

Зараз транспарт уступіў у перыяд асеньня-зімовых перавозак — найбольш адказны вучастак сваёй работы. Гэта з асаблівай вострасьцю **ставіць перад чыгуначнымі партарганізацыямі задачу — узмацніць канкрэтнае і апэрацыйнае кіраўніцтва вытворчасьцю чыгуначнага транспарту і гэтым самым забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну асеньня-зімовых перавозак.**

Прыклады пастаноўкі партыйнай работы ячэйкай службы цягі Жлобінскага чыгуначнага вузла і парткалектывам Магілеўскага чыгуначнага дэпо і вагоннага парку, дзе цэнтр цяжару партыйнай работы перанесен у нізавое зьвяно вытворчасьці, дзе партыйныя арганізацыі мабілізавалі сябе на барацьбу з абязьлічкай і ўраўнілаўкай, з усёй выразнасьцю паказваюць на простую залежнасьць посьпехаў у выкананьні вытворчых вымяральнікаў ад ступені перабудовы партыйнай работы.

Аднак, яшчэ значная частка чыгуначных партарганізацый, ігнаруючы лёзунг — «тварам да вытворчасьці» — усё яшчэ не адчуваюць адказнасьці за работу сваіх вучасткаў чыгуначнага транспарту. Бязьдзейнасьць **клімавіцкай партыйнай ячэйкі** прывяла да таго, што станцыя Клімавічы яшчэ да гэтага часу не падрыхтавана да асеньня-зімовых перавозак. Ня лепшае становішча мае месца ў парткалектыве службы цягі Магілеўскага чыгуначнага вузла і раду другіх чыгуначных партарганізацый.

Посьпехі ў галіне прамысловасьці, павялічэньне таварнасьці сельскай гаспадаркі на аснове не сацыялістычнай рэканструкцыі, разгорнутыя тэмпы будаўніцтва гігантаў індустрыі павялічваюць запатрабаваньні транспарту ў галіне грузазвароту, які асабліва ў надыходзячы перыяд асеньня-зімовых перавозак значна ўзрасьце.

Толькі новыя формы і мэтады ў кіраўніцтве і арганізацыі работы чыгуначнага транспарту — **правільная расстаноўка партыйных сіл, сыстэматычнае кіраўніцтва і дапамога парторгам, рашучае ўкараненьне прэміяльна-зьдзельнай і пакіёмэтравай аплаты працы, спаранай язды і гаспадарчага разрахунку ва ўсе зьвяньні транспарту забясьпечваюць своячасовае і поўнае выкананьне задач,** якія стаяць перад чыгуначным транспартам.

Пралетары-чыгуначнікі, пад кіраўніцтвам сваіх партыйных арганізацый, павінны вывесьці і бязмоўна вывядуць транспарт на лінію перадавых гаэін народнай гаспадаркі!

ЛЕПШЫЯ ЎДАРНІКІ — У ПАРТЫЮ ЛЕНІНА
Шахцёр тав. ПАЛЯКОЎ, лепшы ўдарнік, вытворчы стаж — 38 гадоў. Уступіў у рады УсеКП(б).

Удасканальваць перабудову партработы, змагацца з большай энэргіяй за новыя посьпехі

Партыйны калектыў дэпо і вагоннага парку **Магілеўскага чыгуначнага вузла** на аснове перабудовы сваёй работы пановаму дабіўся значных дасягненьняў у справе паляпшэньня работы транспарту. Калі яшчэ ня так даўно прастой паравозаў у дэпо быў 7,26 гадзін, дык цяпер ён зьменшан да 6,42 гадзін. Прастоі паравозаў пад гарачай прамыўкай дасягалі раней 13,42 гадзіны, а зараз—толькі 11 гадзін.

Партарганізацыя дэпо і вагоннага парку рашуча ўдарыла па зрыўшчыках спаранай язды. У выніку—ужо ў жніўні месяцы 91,4 проц. паравозаў былі пераведзены на спаранную язду.

Гаспадарчы разрахунак зьяўляецца сапраўдным кантролем выкананьня вымяральнікаў. Брыгады тых паравозаў, якія пераведзены на гаспадарчы разрахунак, дасягнулі значных посьпехаў у справе эканоміі рабочай сілы і апалу. **Брыгада Цыганоўскага** за 15 дзён дала 7,6 тон эканоміі вугля, а брыгада паравозу № 5005 з'эканоміла на працягу аднаго м-ца звыш 100 кгр. змазачных матар'ялаў. У жніўні месяцы дэпо павінна было адрамантаваць 4 паравозы. Рабочыя-ўдарнікі дэпо высунулі сустрэчны план і на аснове разгортваньня спаборніцтва і ўдарніцтва адрамантавалі 5 паравозаў.

Разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод рабочага калектыву чыгуначнага вузла забясьпечыла значнае зьніжэньне крывёй у парушэньні працдысцыпліны.

Усё-ж треба адзначыць, што ў рабоце магілеўскага дэпо і вагоннага парку мае месца рад прарываў у справе ўкараненьня зьдзельшчыны. У радзе вытворчых зьвеньняў зьдзельшчына ўведзена фармальна, улік выпрацоўкі не наладжан.

Зусім іншы малюнак работы мы пакуль даем **у парткалектыве службы руху.** У гэтым калектыве вытворчасьцю ня цікавяцца і ня кіруюць ёю. На таварным двары пануе беспарадак і безгаспадарчасьць. Мае месца залежаньне тавараў. Партыйныя арганізацыі вузла павінны неадкладна, на аснове перабудовы сваёй работы па-новаму, на аснове ператвараньня цэнтру цяжару партыйнай работы ў нізавое зьвяно вытворчасьці забясьпечыць каскрэтнае і апэрацыйнае кіраўніцтва работай чыгуначнага вузла, узьняць тэмпы гэтай работы на належную вышыню.

Прахарэнка.

На поўны ход

Партыйная ячэйка службы руху Жлобінскага чыгуначнага вузла на-баявому ўзялася за перабудову сваёй работы па-новаму. Яшчэ ў пачатку мая ячэйкай былі выдзелены партарганізатары, якія бюро ячэйкі прымацавала да поўных вучасткаў вытворчасьці. Партарганізатарам былі даны канкрэтныя дырэктывы на паляпшэньні работы чыгункі. 20 мая бюро ячэйкі заслухала справаздачы партарганізатараў у напрамку выкананьня даных ім дырэктыў, пасьля чаго гэта пытаньне было перанесена на агульны партыйны сход.

Пры ніжэйшай зьмене былі арганізаваны трыкутнікі, якія перад пачаткам пэўнай работы абгаварылі парадак яе выкананьня, расстаноўку сіл і г. д.

Сыстэматычная праверка выкананьня дырэктыў партарганізатарамі і правільная расстаноўка партыйных сіл на вытворчасьці дала магчымасьць ячэйцы канкрэтна і апэрацыйна кіраваць работай службы руху Жлобінскага чыгуначнага вузла. Ячэйка своячасова распрацавала пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і ліпеньскага — ЦК КП(б)Б, а таксама прамову **тав. Сталіна—сярод камуністаў,** рабочага калектыву і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу.

У выніку шырока разгорнутай масавай работы, **сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплены ўсе члены партыі і 95 проц. рабочых.**

У выніку такой пастаноўкі работы ў ячэйцы, ст. Жлобін вынішла з таго тупіка, у якім яна знаходзілася да гэтага часу. Станцыяй выконваюцца і перавыконваюцца асноўныя вымяральнікі пляну, за што яна выстаўлена першым кандыдатам на ўсесаюзны транспартны конкурс.

За трэці квартал бягучага году адпрацаўленьне цягнікаў паводле раскладу характарызуецца наступнымі лічбамі. Калі ў ліпені плян у гэтым напрамку быў выкананы толькі на 92,4 проц., дык у жніўні гэты процант узрос да 94,3, у верасьні ён дасягнуў ужо 97,7 проц. Значна зьніжан процант прастояў цягнікоў; спэцыялізацыя апошніх праведзена поўнасьцю. Процант выкананьня пляну па маршрутызацыі ўзрос з 80,3 у ліпені да 94,9 — у верасьні.

Усе гэта сьведчыць аб тым, што на аснове перабудовы партыйнай работы па-новаму ячэйка дабілася поўнай ліквідацыі абязьлічкі, укараненьня зьдзельшчыны і спаранай язды і гэтым самым забясьпечыла пасьпяховае выкананьне дырэктыў партыі аб паляпшэньні работы чыгуначнага транспарту.

Аднак, мы не павінны прайсьці міма тых недахопаў, якія яшчэ маюць месца ў рабоце ячэйкі. Ячэйкай вельмі мала аддаецца ўвагі пытаньням росту партыі. За апошні квартал прынята ў кандыдаты партыі толькі 3 чалавекі. Невыстарчальна разгорнута работа на марксыцка-ленінскім выкананьні. Яшчэ ня ўсе члены партыі наведваюць партшколы.

Бюро ячэйкі павінна падцягнуць адстаючыя вучасткі работы і гэтым самым дабіцца поўнага выкананьня пляну асеньня-зімовых перавозак.

А. Машніцкі.

Фарсаваць будаўніцтва Гомельскага порту

Пастанова камісіі выкананьня пры Савеце Народных Камісараў БССР

Заслухаўшы даклад начальніка Гомельскага портбуду тав. МАЛЯРЭНКА і судаклад прадстаўніка НК РСІ БССР тав. ВЯЛІЧКІ аб ходзе будаўніцтва Гомельскага порту, камісія выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што ў даны момант аб'ём і тэмпы будаўніцтва порту ў асноўным выпраўлены і нават на некаторых вучастках ёсьць перавыкананьне плянавых заданьняў.

Але ёсьць яшчэ і недахопы, якія тармозяць правядзеньне мерапрыемстваў па фарсаваньні пачатых пабудоў і падрыхтоўчых работ на пасобных вучастках:

а) няма зацьверджаных праектаў па дэтапах і падрыхтоўчых работ на пасобных вучастках;

б) марудна выконваюцца Хлеббудам работы, зьвязаныя з портбудаўніцтвам, чым затрымліваецца выкананьне работ па прычальнай сьпіці.

в) механізмы—паравыя бабы, і транспарцёры — загружаны ня поўнасьцю, ёсьць значныя прастоі.

г) дрэнна забясьпечаецца портбудаўніцтва рабочай сілай, асабліва мастаўшчыкамі і ў гэтым напрамку гомельскі аддзел кадраў бязьдзейнічае. Кіраўніцтва портбуду ня прымае выстарчальных захадаў да арганізаванага набору рабочай сілы праз заключэньне дагавораў з калгасамі;

д) гомельскім гарадзкім саветам ня прыведзены ў надзейны парадак гарадзкія спускі да порту.

Выходзячы з гэтага, камісія выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Прасіць Народны Камісарыят Воднага Транспарту забясьпечыць будаўніцтва гомельскага порту канчаткова зацьверджанымі праектамі дэталяй адпаведных аб'ектаў.

Даручыць начальніку гомельскага портбуду тав. МАЛЯРЭНКА падаць Народнаму Камісарыяту Воднага Транспарту даклад па гэтым пытаньні.

2. Прапанаваць начальніку электатарнага будаўніцтва тав. СТАЛЯРОВУ не позьней, як праз дэкаду, закончыць работы на тэрыторыі пляцарнага склада, якія затрымліваюць будаўніцтва порту.

3. Прапанаваць начальніку Гомельскага порту тав. МАЛЯРЭНКА на працягу трох дзён дабіцца поўнай загрузкі мэхэнізмаў праз зьнішчэньне абязьлічнага абслугоўваньня, упарадкаваньне тэхнічнага падліку і ўзмацненьне тэхнічнага нагляду.

4. Прапанаваць гомельскаму аддзелу кадраў, пад адказнасьць загадчыка, у дэкадны тэрмін забясьпечыць будаўніцтва порту патрэбнай колькасьцю рабочых-мастаўшчыкоў.

Даручыць начальніку Гомельскага порту тав. МАЛЯРЭНКА зараз-жа заключыць дагавор з калгасамі на арганізаваную нехапаючай рабочай сілы.

5. Катэгарычна прапанаваць старшыні гомельскага гарадзкога савету неадкладна забясьпечыць прыведзеньне ў надзейны парадак гарадзкіх спускаў да порту.

6. Прапанаваць Бепдзяржснабу, пад адказнасьць тав. КАЦА ў дэкадны тэрмін забясьпечыць будаўніцтва Гомельскага портбуду патрэбным асартыментам жалеза, а таксама спэцвопраткай і ботамі.

6. Прасіць Народны Камісарыят Воднага Транспарту ўжыць канчатковы захады для забясьпячэньня будаўніцтва Гомельскага порту каменьнем, спытаць у гэтай справе абязьлічку і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у зрыве дастаўкі каменьня.

8. Прасіць гомельскі гарадзкі прафсавет зьвярнуць увагу на неабходнасьць узмацненьня работы прафэсыянальнай ячэйкі на портбудаўніцтве, асабліва ў галіне разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы і правядзеньня барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы.

Нам. старшыні камісіі выкананьня пры СНК БССР
А. КАЛНІН.
Вык. аб. сакратара камісіі выкананьня пры СНК БССР
Л. ДУБАВІЦКІ.

М. НЕКРЫЧ

АГОНІЯ БРЫТАНСКАГА ІЛЬВА

Крах ангельскай валюты—вынік доўгага працэсу заняпаду брытанскага імпэрыялізму.—Сусьветная вайна скончылася паражэньнем „галоўнага пераможцы" брытанскага імпэрыялізму.—Пачатак «уцяканьня ад фунта» паклалі самі лёндонскія банкіры. Катастрафічнае значэньне паданьня фунта для буржуазнай Англіі можа параўнацца толькі са значэньнем хваляваньняў у флёце. Рабочыя Англіі хутка вылечваюцца ад рэфармісцкіх ілюзій і ўсё большымі і большымі масамі ідуць за лёзунгамі ангельскай кампартыі.

У гістарычных мэмуарах расказваецца, што калі французкі король Людовік XIV, адоўжы сваёй блискучасьцю і царственай шпарлівасьцю да народу, зьбіраў з імперці, адзін з яго прыдворных зірнаблюдаў у роспачы ўскрыкнуў: «Ах, і король-сонца памірае! Што-ж тады есьць пастаяннага на зямлі?».

Такое прыблізна пацуцьцё аўладала сусьветнай буржуазнай грамадзкай думкай, калі на сьвеце прайшла вестка, што брытанскі ўрад пастанавіў спыніць абмен паперовых грошай на золата, ці, як гавораць па-вучонаму, «скасаваць залаты стандарт».

Буйнейшая ў сьвеце гандлёвая фірма «Джон Буль» абанкрутавала і ангельскам, прадстаўніку ў Жэнэве прыпісала выступіць з даіка-тутэйшымі заявамі, што Англія, моў, заўсёды выконвала свае абавязацельствы і намерана выконваць іх у будучым, што ўсё гэта толькі часовая замінка, якая бывае часам нават у самых багатых людзей. Прадстаўнікі капіталістычнага сьвету, якія прысучнічалі пры гэтым, недавер'ем пакачалі галавой, бо тое што адбылася, — **гэта толькі вынік сыстэматычнага заняпаду брытанскага капіталізму, павольнага, але няўхільнага спаўзаньня на шлях да банкруцтва.**

Матутнасьць брытанскага капіталізму складалася ў мінулым з трох элемэнтаў:

1) Англія была **сусьветнай фабрыкай.** Манчэстэр, Паўднёвы Уэльс, Шэфільд, Бірмінгам забясьпечвалі тавярамі заморскія краіны і значную частку Эўропы.

2) Лёндонскі **грашовы рынак служыў сусьветным цэнтрам** для забясьпячэньня ўсіх краін дзяржаўнымі і прыватнымі пазыкамі.

3) Брытанскі флёт займаў ня толькі першае месца ў сьвеце, але і булаваўся з такім разьлікам, каб у любы час перавышаць сваёй матутнасьцю два наибольш матутнейшых флёты іншых краін.

І вось сваё становішча сусьветнай фабрыкі Англія страціла ўжо даўно. Іменна да таго, каб пазбавіцца непасьпечнага банкрэнта ў асобе Нямеччыны, Англія прымала такі актыўны ўдзел у сусьветнай вайне. Вайна гэта, па сутнасьці справы, **скончылася разгромам галоўнага пераможца — брытанскага капіталізму.** За ваенныя годы ўзрос амэрыканскі канкурэнт-багатыр, стварыўся ўдасная прамысловасьць у ангельскіх калёніях і ў тых краінах, якія ўяўлялі сабой традыцыйны рынак збыту брытанскай прамысловасьці. Апрача таго, перамога над Нямеччынай дала Францыі магчымасьць пераабставляць сваю прамысловасьць і выступіць канкурэнтам Англіі на сусьветных рынках.

Калі да вайны рэзэрвовая рабочая армія ў Англіі дасягала 300-400 тысяч чалавек, дык пасьля «перамогі» яна ніколі ня спускалася ніжэй мільёна. Памяншэньне даходаў ад замежнага гандлю, эрэзмула, скарацілі разьмеры вольных капіталаў, якія можна было пазычаць іншым краінам. Нам ужо прыходілася пісаць, як катастрафічна ўплаў за апошнія два гады вынуск капіталаў на лёндонскім рынку. Давер'е да багатага гандляра-фабрыканта крыха-па-крыху пачало падрываць. Пачатак «уцяканьня ад фунта», аб якім цяпер так многа гавораць, паклалі самі-ж лёндонскія банкаўскія ўстановы. Ужо два гады назад у лёндонскіх парляміцкіх колах з абурэньнем гаварылі, што «некаторыя» ангельскія банкаўскія фірмы рассылаюць сваім клиентам цыркулярныя лісты, у якіх раяць прадаваць свае ангельскія каштоўнасьці і ўкласьці грошы ў каштоўнасьці іншых краін, галоўным чынам Францыі і Амэрыкі.

За апошнія паўтары гады становішча лёндонскага грашовага рынку рэзка пагоршылася з-за імклівага падзеньня цэн на сыроц, з прычыны агульнасусьветнага скарачэньня попыту, выкліканага ў сваю чаргу, сыстэматычным падрывам пакупной здольнасьці мас, капіталістычнай рацыяналізацыяй і бязьлітаснай эксплёатацыяй.

Гэта падзеньне цэн і памяншэньне попыту асабліва адбылася на Паўднёвай Амэрыцы і на калёніях, дзе ангельскі капітал уклаў вялізарныя сумы, вылічаныя прыблізна ў 75 проц. усёй сумы ангельскіх укладаньняў за граніцай. Да апошніх год тысячы і дзесяткі тысяч ангельскіх буржуа «рабілі» грошы ў калёніях і потым зварачаліся дадому, нагружаныя золатам. Цяпер яны таксама зварачаюцца да дому, але ў якім стане На Малайскім архіпелазе (цэнтр вырабу каўчука і цыну), чытаем мы ў буржуазным друку, часта, моў, не адрозьніш эўрапэйца ад кітайскага кулі. Тысячы людзей, пішуць яны, якія жылі ў раскошных вілах, акружаныя натоўпам жоўтых служкаў, цяпер знайшлі сабе прытулак у маленьких хаціках партовых прадмесьцяў. Калі якінсія параходы зварачаюцца ў Эўропу, дык першыя і другія класы амаль пустыя, але затое нерапоўныя трумныя памяшканьні, у якіх зварачаюцца дадому натоўпы эрэўпаўцаў ад кітайскага кулі. Тысячы людзей, пішуць яны, якія жылі ў раскошных вілах, акружаныя натоўпам жоўтых служкаў, цяпер знайшлі сабе прытулак у маленьких хаціках партовых прадмесьцяў. Калі якінсія параходы зварачаюцца ў Эўропу, дык першыя і другія класы амаль пустыя, але затое нерапоўныя трумныя памяшканьні, у якіх зварачаюцца дадому натоўпы эрэўпаўцаў ад кітайскага кулі.

Падзеньне фунта як быццам сімбалізуе падзеньне простыжу брытанскага імпэрыялізму.

Чымсьці нязвычайным гучэла паведамленьне, што ангельскія турысты за граніцай натоўпам уцякаюць дадому, бо ім не ўдаецца мяняць фунты на **мясцовую валюту.** Італьянскі шынкар і дробны крамнік адмаўляюцца мяняць той самы фунт, які быў сымбалем багацьця і знамога шчасьця для яго дзядоў і прадзедаў.

Крах фунта можа па сваім катастрафічным значэньні для брытанскага капіталізму зраўняцца толькі з хваляваньнямі ня флёце.

Брытанскі флёт быў гонарам ангельскага буржуа і забясьпечваў яму на працягу вякоў прыпісваньне калёніяльных і пакалёніяльных народаў.

І вось раптам гэты флёт са зброі прызначэньня далых краін і народаў ператвараецца ў зброю супроць сваёй упаснай буржуазіі.

Ня треба перапрыняваць непасрэднага рэвалюцыйнага значэньня гэтых падзей. Але ўжо і цяпер мы бачым, што ангельскі матрос перастае верыць у «сьвятасьць традыцыі». Не даманглі і палітычныя агенты, якія пад назвай «афіцэраў-інструктараў» старанна займаліся ў апошнія гады «адукацыяй» матроскіх мас. Скроз усе кардоны да матросаў дакоцілі рэвалюцыйныя ідэі, якімі цяпер пазычана атмасфэра буржуазнага сьвету.

Брытанская буржуазія і разам з яю увесь сусьветны капіталізм да сьмерці перапалоханы. Уражаньне ад забастоўкі ва флёце пагыбляліся яшчэ падзывчай блытанымі тлумачэньнямі, якія давалі члены ўраду ў палаце вобшчын. У часе спрэчак (між іншым, надзвычай стрыманых, бо дэпутаты прасілі «не распаўсюджвацца») выявілася, што былі зроблены «анты варожасьці» ў адносінах да афіцэраў і нават простых гвалт, як заявіў дэпутат Кензорці. Зрывалі пагоны?—Тос... не гаварэце чучна... Сэр Остын Чэмберлен на гэты раз раптам паказаў сябе... «добрым дзядзькай».

«Я абадаю ад імя ўраду — заявіў ён, — што ніякія рэпрэсыўныя меры ня будуць прыняты ў адносінах да матросаў. Мінулае няхай будзе мінулым, мы глядзім уперад, а не назад».

Ангельскі флёт яшчэ не паўстаў. Большасьць ангельскай рабочай «класы яшчэ далёка не заваявана слаўнай ангельскай кампартыяй. Але гісторыя рухнецца ўперад гіганцкімі крокамі.

Яшчэ нядаўна мяшчанскія наведвальнікі Англіі з эўропейскага матэрыка расчулена гаварылі, што «ангельскі чалавек любіць пёрда». Хто пасьмее сказаць гэта цяпер? Ангельскі рабочы да нядаўняга часу адровьніваўся сваёй «лёяльнасьцю да лідэра». Тыя, якія мелі справу з ангельскімі рабочымі, ведаюць, што гаварыць ім аб адрадніцтве Мандональда, Гендэрсона і іншых «правадыроў» было-б вусім безкарысным. Цяпер-жа — прайшоў усяго год — паўтары — тэтых самых лідэраў гоняць з трыбуны. Нават такому «паважанаму чалавеку», як Ленсбэрн, не далі гаварыць на мітынгу. Стары арганізатар савэту маракоў Бэн-Тынет, выходзячы з трыбуны, в абурэньнем гаварыў: «Вось да чага я дажыў пасьля работы цэлага жыцьця». Гендэрсон ня сьмее паказвацца на масавых сходах, а Мандональду, як відома, па-просту запрапанавалі адмовіцца ад мандату.

Ангельская рабочая аляса ніяк ўсяго гады два назад ішла за ілжывымі і здрадніцкімі лейбарыстскімі лёзунгамі «канструкцыйнага сацыялізму». Зараз яна нападзвае стотысячныя дэманстрацыі і ўступае ў бойку з паліцыяй.

«Пэйт моў рацыю» — заяўляюць усе часьцей рабочыя, успамінаючы выкрываўчыя прамовы правадыра ангельскай кампартыі.

Усё гаворыць за тое, што гэта фраза вельмі хутка стане лёзунгам мільёнаў ангельскіх рабочых, якія яшчэ нядаўна паслухмяна сьледзілі за сацыял-фашысцкімі правадырамі.

Крах ангельскай валюты—вынік доўгага працэсу заняпаду брытанскага імпэрыялізму.—Сусьветная вайна скончылася паражэньнем „галоўнага пераможцы" брытанскага імпэрыялізму.—Пачатак «уцяканьня ад фунта» паклалі самі лёндонскія банкіры. Катастрафічнае значэньне паданьня фунта для буржуазнай Англіі можа параўнацца толькі са значэньнем хваляваньняў у флёце. Рабочыя Англіі хутка вылечваюцца ад рэфармісцкіх ілюзій і ўсё большымі і большымі масамі ідуць за лёзунгамі ангельскай кампартыі.

Аўраменка зьнят з работы

КЛІМАВІЦКАЯ ЧЫГУНАЧНАЯ ПАРТ'ЯЧЭЙКА не мабілізавала сябе на выкананьне задач, якія стаяць перад чыгуначным транспартам. Пастанова чэрвеньскага пленуму ЦК аб транспарце ні парт'ячэйкай, ні сярод рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу не распрацоўвалася. Наколькі ячэйка «цікавіцца» вытворчасьцю сьведчыць тое, што на бюро ячэйкі і на партсходзе ўжо на працягу трох месяцаў не стаяла пытаньне аб вытворчасьці.

У выніку—вакзал Клімавічы зусім не падрыхтаваны да асеньня-зімовых перавозак. Плян іх ня складзен да гэтага часу. Моў месца выпадак, калі з-за нядбайных адносін да работы пасобных работнікаў быў спушчан у кар'ер цягнік. Тэмпы работы па будаўніцтве інтэрнату для грузчыкаў ні ў якім разе не забясьпечваюць своячасовага яго скончаньня.

Нядаўна пытаньне аб рабоце клімавіцкай чыгуначнай ячэйкі разглядалася на бюро РК КП(б)Б ЗА АПАРТУНІСТЫЧНУЮ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЬ ЗЬНЯТЫ З РАБОТЫ САКРАТАР ЯЧЭЙКІ АЎРАМЕНКА. Бюро райкому намеціла ряд практычных мерапрыемстваў, якія павінны легчы ў аснову работы новага кіраўніцтва партыйнай ячэйкі. Гэтыя мерапрыемствы павінны быць неадкладна ператвораны ў жыцьцё.

В. Ф.

ШВЭЙНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ

ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРАМОГУ

БАЛЬШАВІЦКІМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЛЯНАЎ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ ПАВІННА БЫЦЬ МАКСЫМАЛЬНА УЗЬНЯТА

Тэлеграма сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ

Швэйаб'яднаньню БССР, копія ЦП саюзу швэйнікаў

ВІТАЮ РАБОЧЫХ І ГАСПАДАРНІКАЎ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ВЫКАНАЎШЫХ ПЯЦІГОДКУ ЗА ТРЫ ГАДЫ.

ЗАКЛІКАЮ НАКІРАВАЦЬ УСЕ НАМАГАНЬНІ ДА ВЫРАЗНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ЎКАЗАНЬНЯЎ ТАВ. СТАЛІНА І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ 4-ГА КВАРТАЛУ.

ГЕЙ.

Будзем змагацца за прамфінплян з яшчэ большай упартасьцю і энэргіяй

З рапарту швэйнай фабрыкі „Прафінтэрн"

Фабрыка «ПРАФІНТЭРН» выканала паводле 5-цігадовага пляну па колькасным выпуску прадукцыі заданьне 1932-33 г. на 95,7 проц., па зьніжэньні сабекошту замест 13,3 проц. за 5 год — 17,1 проц. за 3 гады. Па прадукцыйнасьці працы: замест 148 проц. за 5 год — 156 проц. за 3 гады. Выдаткасана ўсяго па прамысловасьці і капітальных работах 73 проц. асыгнаваньняў 5-цігадовага пляну.

У выніку ўпартага бальшавіцкага змаганьня рабочых на чале з трыкутнікам фабрыкі «Прафінтэрн» у справе выкананьня 5-цігадовага пляну за 3 гады, мы дабіліся яшчэ аднэй вялікай перамогі — з нетраў старай фабрыкі «Прафінтэрн» ВЫРАС НОВЫ ГІГАНТ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», ЯКІ ЗАРАЗ НАЛІЧВАЕ КАЛЯ 5.000 РАБОЧЫХ.

Рабочыя фабрыкі «Прафінтэрн», ня спыняючыся на дасягнутых посьпехах, яшчэ з большай упартасьцю і энэргіяй гатовы рашуча змагацца за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў пляну 2-й пяцігодкі.

Сакратар калектыву КП(б)Б КРЫМКЕВІЧ.
Дырэктар фабрыкі КАГАН.
Фабком ПЕЙСАХОВІЧ.

Прывітаньне ЦК саюзу швэйнікаў

Менск ЦП швэйнікаў Беларусі і Белшвэйаб'яднаньню

ПРЭЗЫДЫУМ ЦК САЮЗУ ШВЭЙНІКАЎ ГОРАЧА ВІТАЕ РАБОЧЫХ І АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНЫ ПЭРСАНАЛ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БЕЛАРУСІ З ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПЯЦІГОДКІ ЗА ТРЫ ГАДЫ. ШВЭЙНІКІ БЕЛАРУСІ ПАКАЗАЛІ НА СПРАВЕ ЎМЕНЬНЕ ЗМАГАЦЦА ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ БУДОЎЛЮ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БАЛЬШАВІЦКІМІ ТЭМПАМІ.

ГЭТУ ПЕРАМОГУ ТРЭБА ЗАМАЦАВАЦЬ ДАЛЕЙШЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ НОВАЙ ПЯЦІГОДКІ.

ЦК САЮЗУ ЗВАРАЧАЕ ЎВАГУ ШВЭЙНІКАЎ БЕЛАРУСІ НА НЕАБХОДНАСЬЦЬ ПАЛЯПШЭНЬНЯ ЯКАСЬЦІ ВЫПУШЧАНАЙ ПРАДУКЦЫІ.

ЦК ВЫРАЖАЕ ЦЬВЁРДУЮ ЎПЭЎНЕНАСЬЦЬ, ШТО ШВЭЙНІКІ БЕЛАРУСІ ПА-ЛЕНІНСКУ ВОЗЬМУЦЦА ЗА ЛІКВІДАЦЫЮ БРАКУ, ЗА МАСАВАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ЭЬМЕННА-СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНАВАНЬНЯ, ЗА АРГАНІЗАЦЫЮ ГАСПАДАРЧА-РАЗРАХУНКОВЫХ БРЫГАД, ЯК ВЫШЭЙШАЙ ФОРМЫ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА.

НЯХАЙ ЖЫВУЦЬ ШВЭЙНІКІ БЕЛАРУСІ!

ЦК ПРАФСАЮЗУ ШВЭЙНІКАЎ.

Тэмпы апошняга году пяцігодкі — далёка ззаду

З рапарту Гомельскай швэйнай фабрыкі „Камінтэрн" аб выкананьні пяцігодкі

Швэйная фабрыка «КАМІНТЭРН» скончыла сваю пяцігодку за 2 гады і 8 месяцаў з наступнымі паказальнікамі.

Выпуск прадукцыі ў рублёх: у 1927-28 годзе — 636.000, у 1928-29 г.—3.169 тыс., у 1929-30 г.—9.487 тыс., у 1930-31 г. —17.513 тыс. руб., што складае выкананьне пляну НА 303 ПРОЦ.

Да канца пяцігодкі выпуск прадукцыі павінен быў узрасьці на 835 проц. Аднак, ужо ў трэці год пяцігодкі выпуск прадукцыі ўзрос НА 2.754 ПРОЦ.

Выпрацоўка на аднаго рабочага павышэлася наступным чынам: у 1927-28 г. 100 проц., у 1928-29 годзе — 100,4 проц., у 1929-30 г. — 202 проц., у 1930-31 г. — 251 проц. За 5 год прадукцыйнасьць працы павінна была ўзрасьці на 157,3 проц., а вырасла НА 251 ПРОЦ.

Па зьніжэньні сабекошту прадукцыі мы маем наступныя паказальнікі: у 1928-29 годзе зьніжэньне сабекошту складала 8,7 проц., у 1929-30 г. — 11 проц., у 1930-31 годзе — 6,3 проц. Паводле пляну за пяцігодку намячалася зьніжэньне на 14,3 проц., а ўжо зараз ёсьць 23,8 ПРОЦ.

Вышэйпаданыя лічбы сьведчаць аб тым, што па ўсіх паказальніках тэмпы апошняга году пяцігодкі выкананы і перавыкананы.

Мы шмат ужо зрабілі ў галіне рэалізацыі апошніх паказаньняў т. Сталіна. Ліквідавалі канчаткова прынцып аплаты па апошняй руцэ. Перавялі працу на чатырохбрыгадны мэтад. Вядзем рашучую барацьбу з абязьлічкай. Рад рабочых на вядучых працэсах підзачнага цэху пераведзены на вышэйшыя разряды. Уведзен індывідуальны ўлік работы кваліфікаваных рабочых. З 1 верасьня ўведзена праграэсыўна-прэміяльная аплата працы. Падрыхтавалі рабочую кваліфікаваную сілу і бярэм курс на заключэньне дагавораў з калгасамі і жактамі.

Усе цэхі фабрыкі пераведзены на гаспадарчы разрахунак. Зараз прыступілі да пераводу брыгад. Дзьве брыгады ўжо пераведзены, пачынаем уводзіць зьменна-сустрэчныя пляны па групах.

Пабудавалі ясьлі на 90 дзяцей і канчаем пабудову кухні, клюбу і дому швэйнікаў.

Аднак, мы маем яшчэ наступныя недахопы. Якасьць нашай прадукцыі патрабуе яшчэ далейшага паляпшэньня. Дрэнна ў нас пастаўлена культабслугоўваньне рабочых. Сталоўка яшчэ ня стала цэхам прадпрыемства, наглядаюцца чаргі. Прарыў у выкананьні прамфінпляну за ліпень і жнівень месяцы яшчэ не пакрыты.

Пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву гэтыя недахопы будуць ліквідаваны ў чэцьвертым квартале.

Сакратар парткалектыву КАНТАРАЎ.
Дырэктар фабрыкі РАХНОВІЧ.
Старшыня фабкому ГЕРШМАН.

САНМІНІМУМ

МЕНСКІЯ АБУТНІКІ на справе змагаюцца ЗА САНМІНІМУМ

НА АРШАНСКІМ КАМБІНАЦЕ САНМІНІМУМ—У ЗАГОНЕ

Брыгада ў складзе Аршанскага інспэктара аховы здароўя, памочніка санітарнага доктара, старшыні саюзу работнікаў аховы здароўя і прадстаўніка заводакіраўніцтва правяла дэтальны санітарны агляд усіх цэхаў Аршанскага мясакамбінату. Праверка выявіла рад парушэньняў санітарнага мінімуму на прадпрыемстве. Працаваўшая там брыгада на чале з доктарам Ласкіным зусім бяздзейнічала.

Адміністрацыя ігнаруе санітарны мінімум. У халадзільніку і ў радзе камэр падлогі пакрыты брудам і вадой. Адкіды ад убою жывёлы не скарыстоўваюцца, а валяюцца на брудной падлозе, гэніталіцыя не працуе.

Ва ўсіх цэхах, апрача варыльнага, няма разьдзявалень.

Зусім невыстарчальна забясьпечваюцца рабочыя спэцвопраткай: халатамі, хвартухамі і абуткам. Такое становішча значна адбіваецца на прадукцыйнасьці і якасьці працы. У варыльным цэху для выкананьня санмінімуму на[illegible] асабліва значэньне, рабочыя [illegible]ць у брудных халатах, якія мяц[illegible] толькі два разы ў месяц. У [illegible] дрэнным станоўішчы знаходзі[illegible] бандарны цэх, дзе няма пыла[illegible] вокны пабіты, няма падправо[illegible] рэфрыжэратараў.

[illegible]сталоўцы яшчэ 19-га верасьня пачаты рамонт, які ідзе вельмі павольнымі тэмпамі. У сувязі з гэтым харчаваньне рабочых значна пагоршылася.

Двор ва многіх мясцох забруджан сьмецьцем, рознымі адкідамі. Каля галоўнага корпусу і ўцільцэху ляжаць групы касьцей і іншых адкідаў. У каапэрацыйнай краме вельмі цесна. Крама завалена тарай і парожнымі бутэлькамі.

Адміністрацыя заводу павінна ў 2-хтыднёвы тэрмін ліквідаваць адзначаныя недахопы, зьвярнуўшы галоўную увагу на хутчэйшае сканчэньне рамонту сталоўкі. Трэба забясьпечыць спэцвопраткай і абуткам рабочых усіх цэхаў, рэгулярна мяняць халаты рабочым кубаснага і варыльнага цэхаў; выдаць акуляры рабочым бандарнага цэху, прыстасаваць скрынкі для адкідаў вытворчасьці; забясьпечыць цэхі аптэчкамі і бакамі з гатаванай вадой, пабудаваць разьдзявальні ў цэхах.

КАЛТУР, ЯЎСЮКОЎ, ГУРЭВІЧ і ЭЛЬКІН.

Праверка рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна (сталінская эстафэта) на маскоўскім заводзе імя 1905 г. праходзіць з вялікім энтузіязмам. Створаны 24 новыя гаспадарча-разрахунковыя брыгады. 16 брыгад ужо заключылі паміж сабою дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва. Ліквідуецца абязьлічка, разгорнута вялікая работа па тэхнічнай вучобе. 90 рабочых пасланы ў ВТНУ і на рабфакі. 252 чал. ахоплены тэхнічнымі гурткамі. Створаны курсы для перакваліфікацыі чорнарабочых (такарныя, сьлясарныя, сталярныя і г. д.). На заводзе рашуча паляпшаецца грамадзкае харчаваньне — будуецца новая кухня, у цэхах адкрываюцца буфэты.

НА ЗДЫМКУ: лепшая гаспадарча-разрахунковая брыгада № 3 пасажырскага цэху, якая атрымала пераходны сьцяг па «сталінскай эстафэце».

Замацаваць першыя посьпехі

ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ УКЛЮЧЫЛІСЯ У ПРАВЯДЗЕНЬНЕ САНМІНІМУМУ, У КАНЦЫ ЖНІЎНЯ ЗАКЛЮЧЫЛІ ДАГАВОР ПАМІЖ АДМІНІСТРАЦЫЯЙ ФАБРЫКІ, ФАБКОМАМ І МЭДПУНКТАМ НА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ АСНОЎНЫХ САНІТАРНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ. ШМАТТЫРАЖКА ФАБРЫКІ ПРАВЯЛА РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ БЫТАВЫХ УМОЎ РАБОЧЫХ І ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ. ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ САЦДАГАВОРУ ЎЖО ВЫКАНАНА. ПАШЫРАНА РАЗЬДЗЯВАЛЬНЯ. ПРЫВЕДЗЕНЫ Ў НАЛЕЖНЫ ВЫГЛЯД ЦЭХІ.

ЦЭХІ І СТАЛОЎКА ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ ГАТАВАНАЙ ВАДОЙ.

ЗАЦЯГНУЛАСЯ СПРАВА З РАМОНТАМ ПАМЯШКАНЬНЯ СТАЛОЎКІ І МЭДПУНКТУ. БЕЛСКУРАВ'ЯДНАНЬНЕ ДОЎГА АДМАЎЛЯЛАСЯ ВЫДАЦЬ АСЫГНАВАНЫЯ ПА КАПТАРЫСЕ СРОДКІ. ДЗЯКУЮЧЫ ДАПАМОЗЕ ДРУКУ, ФАБРЫЧНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ УДАЛОСЯ АТРЫМАЦЬ ГРОШЫ І ПРЫСТУПІЦЬ ДА РАМОНТУ. МЭДПУНКТ ЎЖО АДРАМАНТАВАНЫ, РАМОНТ СТАЛОЎКІ СКОНЧЫЦЦА Ў КАНЦЫ ГЭТАГА МЕСЯЦА.

ПЕРШЫЯ ПОСЬПЕХІ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА САНМІНІМУМ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗАМАЦАВАНЫ Ў ДАЛЕЙШЫМ. АДМІНІСТРАЦЫЯ ПАВІННА ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ, УЗЯТЫЯ ПА САЦДАГАВОРЫ.

НІКІЦІН.

«НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ»

РАГАЧОЎ—У ГЛЫБОКІМ ТЫЛЕ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

РАГАЧОЎ. (Наш кар.). Гадавы плян збожжазагатовак па Рагачоўскім раёне на 1 кастрычніка выкананы на 24,8 проц. Паасобныя сельсаветы—АЗЯРАНСКІ, ЗБАРАЎСКІ, КУРЧАНСКІ, АСАЎНІЦКІ і інш. праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у збожжазагатоўчай кампаніі. Партыйныя ячэйкі гэтых сельсаветаў таксама ня прымаюць мер для своячасовага выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па загатоўках збожжа.

Кулацка-заможныя гаспадаркі, скарыстоўваючы бязьдзейнасьць сельсаветаў, ухіляюцца ад выкананьня цьвёрдых заданьняў. На 1-га кастрычніка цьвёрдыя заданьні па гэтых сельсаветах спагнаны ўсяго на 4—6 проц.

РК КП(б)Б паслаў на месцы 50 упаўнаважаных для дапамогі сельсаветам у правядзеньні збожжазагатовак. Аднак, належнага зруху пакуль што няма. У радзе сельсаветаў упаўнаважаныя літаральна бязьдзейнічаюць і зводзяць усю сваю работу да... пасылкі розных зводак раённым арганізацыям.

Толькі чатыры сельсаветы ў раёне ідуць у авангадзе збожжазагатоўчай кампаніі і дабіліся перамогі: СТАРАСЕЛЬСКІ сельсавет на 1 кастрычніка выканаў плян здачы збожжа на 59,8 проц., КІСЬЦЕНЯЎСКІ—на 59,4 проц. ВЫШАНСКІ—на 49,2 проц. і ДАЎСКІ —на 48,9 проц.

Раённыя арганізацыі не скарыстоўваюць вопыт гэтых перадавых сельсаветаў для падцягваньня адсталых, не арганізуюць грамадзкіх буксіраў, не разгортваюць сацспаборніцтва ў калгасах і саўгасах.

Райкаапсаюз ня здолеў нападзіць сыстэматычнае кіраўніцтва сваёй сыстэмай. Значная частка каапупаўнаважных зусім не адпавядае свайму прызначэньню.

Сярод калгасьнікаў, беднякоў і серад нікоў не праводзіцца ніякай масавай работы ВАКОЛ ВЫКАНАНЬНЯ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ І КАНТРАКТАЦЫЙНЫХ ДАГАВАРОЎ. У ВЫШАНСКІМ, СТАЎПНЯНСКІМ, МЯРКУЛАВІЦКІМ, ГАРАДЗЕЦКІМ, М. СТРАЛКОЎСКІМ СЕЛЬСАВЕТАХ нават ня ведаюць, колькі павінна паступіць збожжа па кантрактацыі і самаабавязацельствах.

Патрэбен неадкладны і карэнны перарам. Раённыя арганізацыі павінны зараз-жа мабілізаваць увесь актыў і ўсю працоўную грамадзкасьць на выкананьне пляну збожжазагатовак. У кастрычніку трэба ня толькі выканаць месячны плян, але і ліквідаваць поўнасьцю верасьнёўскі прарыў.

І. САЛАДУХІН.

Прэмія—перадавіку збожжазагатовак

КЛІМАВІЧЫ. (НАШ КАР).

МАЛАШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ, РАЗГАРНУЎШЫ БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ, ДАБІЎСЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ НА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ. НА 25 ВЕРАСЬНЯ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКАНАЎ 50,2 ПРОЦ. ГАДАВОГА ПЛЯНУ.

ПРЭЗЫДЫУМ КЛІМАВІЦКАГА РАЙВЫКАНКОМУ ПАСТАНАВІЎ ЗА ПРЫКЛАДНУЮ РАБОТУ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПРЭМІЯВАЦЬ МАЛАШКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ У СУМЕ 150 РУБ. НА АБСТАЛЯВАНЬНЕ НАРДОМУ.

Групавое кармленьне і саграўдная зьдзельшчына павялічылі ўдой на адну трэць

УВАРАВІЧЫ. (Наш кар.). Доўгі час у саўгасе «Уваравічы» панавала падзёшчына і абязьлічка, якія давалі значныя страты. У апошнія месяцы, дырэкцыя, мабілізаваўшы грамадзкасьць, зрабіла круты пералом, пасгаўраўнаму ўзялася за ўкараненьне зьдзельшчыны ва ўсіх галінах гаспадаркі.

Па скотным двары канчаткова ліквідавана абязьлічка і падзёшчына. Даяркі аплачваюцца зьдзельна па колькасьці выдаеных літраў. Цяпер даяркі зацікаўлены, наб бепш і лепш выдаіць кароў.

Для скотнікаў уведзена групавое (вага, рост, парода) кармленьне кароў. ГРУПАВОЕ КАРМЛЕНЬНЕ ЗА НЕВЯЛІКІ ЧАС (ДВА ТЫДНІ) ПАВЯЛІЧЫЛА ЎДОЙ НА АДНУ ТРЭЦЬ.

Усе рабочыя саўгасу ў часе ўборачнай кампаніі былі разьбіты на 19 брыгад. Зараз колькасьць брыгад скарочана да 10. У выніку брыгаднай работы, пры зьдзельнай аплаце, значна перавыконваліся нормы выпрацоўкі.

Саўгас для прэміяваньня лепшых ударнікаў вылучыў фонд у 1600 руб. Ударніку Мойсеенку Еўданіму выдана грашовая прэмія ў 60 руб., Смольнікаву Яўхіму — 50 руб., Старчанку Лазару — 50 руб. і г. д.

Казіміраў.

На штурм бездарожжа

БРЫГАДЫ Мацьвеева і Гадулава

ПАКАЗВАЮЦЬ УДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ

Характарызуючы работу 9-й дарожнай дыстанцыі ў часе месячніка, трэба першна-перш падкрэсьліць, што, апрача адміністрацыі і тэхпэрсаналу, ні адзін рабочы ня ведае аб месячніку штурму прарываў у дарожным будаўніцтве. Масавая растлумачальная работа аб месячніку зусім не разгорнута.

Заданьне па дарожным будаўніцтве на 1931 г. выканана толькі на 60 проц. Адна з прычын прарываў—надахват каменьня. Да 1-га кастрычніка г. г. павінна было быць прывезена 2000 вазоў, дастаўлена толькі 200. Белдарбуд, замест красавіка прыслаў абоз у чэрвені—амаль на два месяцы пазьней тэрміну.

Абоз выконвае 50 проц. таго заданьня, якое ён павінен выканаць. Коняй кормяць вельмі дрэнна, на дыстанцыі ёсьць шмат коняй бяз фурманак.

На 9-й дыстанцыі працуе мала машын, але і тыя машыны, якія ёсьць, выкарыстоўваюцца зусім слаба. Паравая баба звыш 2 месяцаў стаяла бяз справы. Два трактары штодзенна маюць вялікія прастоі.

Тэхпэрсанал на дыстанцыі зусім малады. Маладому тэхніку тав. Кацу даручылі самы цяжкі вучастак, які знаходзіцца на балоце. У тав. Каца праца ідзе слаба, а кіраўніцтва і вышэйшы тэхпэрсанал не дапамагаюць яму ў рабоце.

На будаўніцтве няма правільнага падзелу працы. Кваліфікаваныя рабочыя часта выконваюць некваліфікаваную работу, каменшчыкі самі брукуюць, самі б'юць шчабень, самі трамбуюць.

Вельмі дрэнна праводзіцца расплата з рабочымі. Выплата, ня гледзячы на наяўнасьць грошай, часта затрымліваецца на 1-2 месяцы. Мясцовыя органы ня прымаюць належных мер, каб прымусіць кіраўніцтва дарожнай дыстанцыі своячасова выплачваць зарплату. Трэба вікаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

На лініі панує ўраўнілаўка. Чорнарабочыя зарабляюць па 7 руб. у дзень, а добрыя майстры-цесьляры па 4 руб., што выклікае ўцечку рабочай сілы. Яўна пад рыдае работу і тое, што Белсельбуд плаціць па больш высокіх расцэнках, чым Белдарбуд.

Не ажыцьцяўляецца пераход на прэміяльна - зьдзельную аплату працы. На запытаньне, чаму дыстанцыя ня ўводзіць прэміяльнай зьдзельшчыны, прараб Мінкоў адказаў, што Белдарбуд прыслаў тры праекты пераходу на прэміяльную зьдзельшчыну і ніхто ня ведае, якога праекту трэба прытрымлівацца. Ня ўсе прарабы перайшлі на адзіныя рэспубліканскія расцэнкі.

Усё гэта выклікае значную ўцечку рабочай сілы. З курсаў каменшчыкаў было прыслана 56 курсантаў, засталося толькі 8. Курсантаў скарыстоўвалі на розных работах, толькі не па іх спэцыяльнасьці і наогул аддавалі ім мала ўвагі. Мост на 19 кілёмэтры павінен быў быць скончан у 1930 г., пабудова яшчэ ня скончана з-за недахвату рабочай сілы.

Камсамол мабілізаваў моладзь на дарожнае будаўніцтва, бяз усякай растлумачальнай работы. У выніку на «вэскрэсьнік», які павінен быў адбыцца 4-га кастрычніка, ня выйшаў ні адзін чалавек. Райпрафсавет сарваў намечаны вэскрэсьнік. Работа ячэйкі камсамолу дзевятай дыстанцыі зусім не адчуваецца.

ПРАФЭСЫЯНАЛЬНАЯ РАБОТА на дарожным будаўніцтве праводзіцца вельмі дрэнна. Не арганізавана ніводнага гуртка. Ня гледзячы на наяўнасьць нялісьменных, ні адзін гурток лікбезу не працуе. На будаўніцтве вы ня сустрэнеце газэт і часопісяў. Вытворчыя нарады не праводзяцца. Ні на адной лініі няма прафупаўнаважнага. Толькі нядаўна райком партыі прыслаў арганізатара масавай работы.

САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА на 9-й дыстанцыі развіта слаба. Аб тым, якое вялікае значэньне набывае сацспаборніцтва на дарожных работах, сьведчыць вопыт арганізаваных ударных брыгад. Брыгада каменшчыкаў тав. МАЦЬВЕЕВА перавыканала нормы месячніка штурму на 10 кв. метраў. Ударнік - каменшчык тав. ІЦКОВІЧ дасягнуў рэкордная нормы—44 кв. мэтры за 8-гадзінны рабочы дзень. Ударная брыгада камнябойцаў тав. ГАДУЛОВА працуе з вялікім энтузіязмам: замест 2,9 кубамэтра па норме, яна дае па 7 кубамэтраў. Ударнікі АРСЮКОЎ і СКВАРЦОВ выпрацоўваюць па 9 кубамэтраў каменьня за 8-гадзінны рабочы дзень.

Брыгада цесьляроў тав. ЛЯЙКОЎСКАГА выканала заданьне за апошні квартал на 100 проц. і выклікала на сацспаборніцтва іншыя арцелі.

Мала ўвагі аддаецца рабочаму забесьпячэньню. Цукар, напрыклад, не выдаецца таму, што вага папсавана.

Рукавіцы ляжаць на складзе, а каменябойцы працуюць без рукавіц.

Буйнейшыя калгасы «Ляццо» «Блонь», калгас імя Калініна ўхіляюцца ад заключэньня ўмоў на вярбоўку рабочай сілы.

Пры ўмове правядзеньня шырокага прафэсыянальнай работы, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пры належнай мэханізацыі работ, плян дарожнага будаўніцтва па 9-й дыстанцыі можа быць выканан поўнасьцю.

Брыгадзір «Зьвязды»
М. МАРГОЛІН—Пухавічы.

Месячнік барацьбы з бездарожжам

ВУШАЧЫ. (НАШ КАР.). З 1-ГА КАСТРЫЧНІКА ПА 1 ЛІСТАПАДА Ў ВУШАЦКІМ РАЁНЕ ПРАВОДЗІЦЦА МЕСЯЧНІК БАРАЦЬБЫ З БЕЗДАРОЖЖАМ. 3-ГА І 6-ГА КАСТРЫЧНІКА НАЛАДЖАНЫ МАСАВЫЯ ПЛАТНЫЯ СУБОТНІКІ, У ЯКІХ ПРЫНЯЛІ ЎДЗЕЛ ЖЫХАРЫ ЖАРСКАГА, МАЗЫРСКАГА, ГАРБАЦІЦКАГА, ЗАРАЧЫНСКАГА, УСАЙСКАГА, САРАЧЫНСКАГА І ІНШЫХ СЕЛЬСАВЕТАЎ.

КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫЛУЧЫЛА 75 ЧАЛ., ЯКІЯ НА ПРАЦЯГУ МЕСЯЦА БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА ДАРОЖНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ ДАРОЖНАГА БУДАЎНІЦТВА

Нядаўна адбыўся першы зьлёт ударнікаў 2-ой дарожнай дыстанцыі. Ударнікі пастанавілі намагчы ўсе сілы, каб датэрмінова скончыць зямляныя работы і пабудову маста; весьці рашучую барацьбу за якасныя і колькасныя паказальнікі прамфінпляну, не дапускаючы пагоні за колькасьцю, за кошт якасьці.

Удзельнікі зьлёту замацавалі сябе па будаўніцтве да канца работ і выклікалі пасьледаваць іх прыкладу ўсіх рабочых дыстанцыі.

Ударнікі абвясьцілі рашучую барацьбу прагульшчыкам, якія парушаюць працдысцыпліну і зрываюць плян будаўніцтва.

Ударнікі- грабары ўзялі на сябе абавязацельства ліквідаваць прарыў на першым вучастку дыстанцыі на выемцы зямлі, у тэрмін выехаўшы на работу.

Зьлёт узяў на сябе абавязак правесьці растлумачальную работу на конт рэалізацыі пазыкі.

На зьлёце былі выдаены 32 прэміі лепшым ударнікам 2-й дыстанцыі.

Плёска.

Не пашлі далей агульных пастаноў

З дарожным будаўніцтвам ў Клічаўскім рабоне справа стаіць зусім дрэнна. Не адрамантавана ні адной дарогі, ні адн[illegible]каго маста, не гаворачы аб пабудове но[illegible]вых. Пакінаныя дарогі хутка прымуп[illegible] такі выгляд, што па іх будзе зусім н[illegible] магчыма ехаць.

Прарывы ў дарожным будаўніцтв[illegible] тлумачацца тым, што РВК і сельсавет[illegible] ня здолелі мабілізаваць грамадзкай дум[illegible] і вокал значэньня гэтай справы, [illegible] прынялі выстарчальна рашучых мер д[illegible] вярбоўкі рабочай сілы.

Райпісэктар па дарбудаўніцтве [illegible] сыгналізаваў аб прарывах. Ён увес[illegible] летні час толькі плянаваў будаўніцтв[illegible] адной з дарог і нічога не зрабіў.

Райком партыі вынес рад пастаноў [illegible] гэтым пытаньні, абвясьціў дакадн[illegible] штурму, а канкрэтных выпікаў пакул[illegible] няма.

Ганчаронак.

Агляд работы саветаў

СЭКЦЫЯМ САВЕТАЎ— МОЦНЫ ПРАЛЕТАРСКІ АКТЫЎ

Вопыт Ленінграда і Харкава— Менскаму Гарсавету

У гутарцы з нашым супрацоўнікам сакратар Менскага гарсавету тав. ШАЛКАВЕЦ падзяліўся вынядамі брыгад з членаў гарсавету, якія езьдзілі для азнаямленьня з масавай работай Ленінградзкага і Харкаўскага гарсаветаў.

— Грунтуючыся на станоўчым вопыце Ленінграда і Харкава, трэба ажыцьцявіць рад мер па палянпшэньні работы Менгарсавету. Асноўная задача — палянпшэньне масавай работы, узмацненьне сувязі з выбаршчыкамі, узьняцьце актыўнасьці дэпутатаў. Масавай работай павінен кіраваць арганізацыйна-масавы аддзел гарсавету. Павінны быць пашыраны правы сэкцый.

Раней сэкцыі вынесьлі пастановы, якія ня мелі моцы без зацьвярджэньня іх прэзыдыумам гарсавету; прэзыдыум не спраўляўся з разглядам усіх пастаноў і зразумела, многія з іх заставаліся на паперы. Зараз трэба ўвесьці такі парадак, каб пастановы сэкцый былі канчатковымі і абавязковымі для выкананьня. Гэта патрабуе выразнасьці і аператыўнасьці ў рабоце сэкцый. Кожная сэкцыя павінна мець свае пастаянныя камісіі па праверцы каказу. Сэкцыя павінна складацца з брыгад, прымацаваных да паасобных гапін работы сэкцый.

У саўдагаворы паміж Менскім, Віцебскім і Гомельскім гарсаветамі ёсьць пункт аб прыцягненьні да работы гарсавету актыву з рабочых і студэнтаў.

Менгарсавет абавязаўся ўцягнуць у актыўную работу 1000 рабочых. На сённешні дзень абавязацельства выкананы толькі на 50 проц. Неадкладная задача — перабудаваць масавую работу, стварыць моцны савецкі актыў.

Па прыкладзе Ленінградзкага і Харкаўскага гарсаветаў, трэба надаць права станоўчага голасу актыву, прыцягнутаму да работы сэкцый.

Тульскі гарсавет зьвярнуўся да ўсіх гарсаветаў БССР з адозвай — выканаць да 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі пастанову ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы каапэрацыі. Гэта задача стаіць зараз перад сэкцыяй рабочага забесьпячэньня Менгарсавету.

Карэнная перабудовы патрабуе работа сэкцыі прамысловасьці, якая яшчэ не павярнулася тварам да прадпрыемстваў. Сэкцыі прамысловасьці Ленінградзкага і Харкаўскага саветаў устанавілі кантрольныя пасты ў тых цэхах, дзе ёсьць прарывы. Абавязак пастоў своячасова сыгналізаваць аб гэтых прарывах, аб канкрэтных вінаватых і аб мерах ліквідацыі прарываў. Сэкцыі ў сваёй рабоце апіраюцца на дэпутацкія групы. Гэты вопыт павінен быць скарыстаны сэкцыяй прамысловасьці Менгарсавету.

Пашырыць масавую работу

Нядаўна адбылося пасяджэньне аб'яднанага пленуму фінансава-падатковай бытавой сэкцыі Менскага гарадзкога савету. На пленуме былі заслуханы даклады т. т. Шапкаўца і Макрушыц аб выніках паездкі брыгад, пасланых для азнаямленьня з работай Ленінградзкага і Харкаўскага гарадзкіх саветаў. Даклады асабліва падрабязна характарызавалі масавую работу саветаў, формы сувязі іх з выбаршчыкамі, мэтады узьняцьця актыўнасьці мас, дзейнасьць дэпутацкіх груп на прадпрыемствах і г. д.

У Харкаўскім гарсавеце, пашырыла арганізацыйна- масавы аддзел гарсавету складаецца з 12 чал., з іх 5 штатных інструктароў. Сэкцыі самастойна вырашаюць усе справы. У прэзыдыум гарсавету перадаюцца найбольш важныя прыцягненьня пытаньні. Сэкцыі выдучаюць столькі брыгады, якія праводзяць усю бягучую работу. Загадчык аддзелу зьяўляецца старшынёй сэкцыі. Міма апошняга не праходзіць ні адно пытаньне, якое ня датычыць. У сэкцыях працуюць па 2 вызваленых работнікі.

У Парадускім раённым савеце Ленінграду многія аддзелы савету зусім ліквідаваны. Іх функцыі выконваюць сэкцыі са сваім апаратам. Дзякуючы ліквідацыі аддзелаў, удалося скараціць апарат на 30 проц. бо да актыўнай работы прыцягнуты самі дэпутаты. Пры сэкцыях існуюць камісіі па праверцы выкананьня наказу выбаршчыкаў і пастаноў сэкцыі.

На дакладах разгарнуліся вельмі ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя адзначылі неабходнасьць палярэднія апіраацыйных функцый і самастойнасьці сэкцый гарсавету. Пры сэкцыях трэба стварыць камісіі праверкі выкананьня наказаў.

Аб'яднаны пленум даручыў прэзыдыуму гарсавету вывучыць практыку Ленінградзкага і Харкаўскага гарсаветаў, ажыцьцявіць апрацаўшы сабе станоўчы вопыт гэтых саветаў.

ЛЕПШАЯ СЭКЦЫЯ—БЫТАВАЯ

Бытавая сэкцыя Менгарсавету ідзе на першым месцы па сваёй рабоце. Сэкцыя налічвае 72 члены з іх толькі 34 дэпутаты гарсавету, астатнія 38 чалавек — актыў. Да 1 сьнежня сэкцыя павінна выразьці да 100 чалавек за лік рабочых і студэнтаў.

За ўвесь час сваёй работы сэкцыя правяла 17 пасяджэньняў бюро сэкцыі і 17 пленумаў. Два пленумы праведзены разам з фінансава-падатковай сэкцыяй, якія ўзята на буксір. Да кожнай бытавой установы ў парадку чаргі прымацоўваюцца члены сэкцыі, праз некаторы час прымацаваныя мяняюцца.

Сэкцыя заслухала даклады 6-ці дырэктароў прадпрыемстваў аб укараненьні жанчын у прам

Год выданьня—XV
№ 274 (4198)
Чацьвер, 8 кастрычніка 1931
Цана нумара 5 кап.
БЕСЬЦЕРА ГЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Кам. Гарэму Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Здань новай фінансавай катастрофы
У НЯМЕЧЧЫНЕ

Катастрафічнае зьніжэньне залатога пакрыцьця нямецкай маркі.—Штодзенна ўцякае з Нямеччыны ад 10 да 35 мільёнаў.—Крах буйных банкаў.—Шырыцца эпыдэмія банкруцтва.--Армія беспрацоўных дасягае шасьці мільёнаў.

БЭРЛІН, 7. Нямеччына знаходзіцца напярэдадні **новых** фінансавых патрасеньняў. Грозная становішча эўрапэйскай гаспадаркі, далейшае паглыбленьне і заваротньне крызісу робяць немагчымым затрыманьне нямецкай маркі нават на цяперашнім узроўні.

30 верасьня залатое пакрыцьцё нямецкай маркі раўнялася 31,2 проц., што складае **паніжэньне на працягу двух тыдняў на 9 проц.** Уцечка золата **ня спыняецца.** У верасьні забрана з нямецкіх банкаў 330 мільёнаў марак золатам. Зараз капіталісты вывозяць з Нямеччыны штодзенна ў сярэднім ад **10 да 35 мільёнаў марак.**

Фінансавы крызіс становіцца ўсё больш вострым. Пасьля банкавага краху ў **Калёніі, пасьля краху банку Шэйн бэрга** ў Бэрліне, зараз зноў збанкрутавалі гандлёвы і прамысловы банк у **Лейпцыгу.**

Цяперашняя сітуацыя ў Нямеччыне павінна давесьці да ўстрыманьня крэдытаў, да далейшага закрыцьця прадпрыемстваў і да вялізарных звальненьняў рабочых. **Пагроза інфляцыі робіцца з кожным разам больш канкрэтнай.**

У сувязі з катастрафічным становішчам у Гамбургу, выплата пэнсіі растэрміноўваецца **на тры разы,** у Брэме служачыя атрымліваюць пэнсію такзама з растэрміноўкай з адначасовым зьніжэньнем яе на 15-23 проц. У Любеку пэнсіі зьніжаны на 5-10 проц.

Эпідэмія банкрутстваў пашыраецца. У трэцім квартале збанкрутавала **5.451 прадпрыемства.**

Армія беспрацоўных дасягае ўжо 6 мільёнаў. Апрача пастаянных беспрацоўных ёсьць вельмі многа напаўбеспрацоўных, бо цэлы рад прадпрыемстваў працуе толькі 2-3 дні ў тыдзень. Заработкі гэтых «шчасьліўцаў» не зьяўляюцца вышэйшымі, чым дапамога беспрацоўным.

Лопнулі 22 банкі за адзін дзень

НЬЮ-ЁРК, 6. Учарашні дзень адзначыўся ў ПАЗШ **масавым банкрутствам правінцыяльных банкаў.** У Філядэльфіі лопнулі **тры банкі.** У вугольных раёнах заходняй Віргініі і Пэнсыльваніі закрылася **8 банкаў, у Нэбраске — 4, у Мінэсоце — 4,** у Мэрылэндзе, Огайо і паўднёвай Караліне — **па адным.** Гувэр склікаў сёньня ў белым доме канфэрэнцыю членаў кангрэсу, якія належаць да абедзьвюх партый (рэспубліканцаў і дэмакратаў). Мэта нарады — забясьпечыць адзінства дзеяньня ў адносінах да фінансавага крызісу.

Банкруцтвы брокерскіх фірм

НЬЮ-ЁРК, 6. У **Монрэале** збанкрутавалі тры буйныя брокерскія фірмы, у Ванкувэлі — адна.

Гуртавікі і раздробнікі павышаюць цэны

СТАКГОЛЬМ, 6. У сувязі з абвастраньнем фінансавага крызісу ў Скандынаўскіх краінах **працягваецца рост цэн.** Дацкія гуртавікі і раздробнікі ліхаманкава павышаюць цэны. Мерапрыемствы ўраду супроць росту цэн ня маюць выніку. У Нарвэгіі насельніцтва некаторых гарадоў **панічна закупляе прадукты,** баючыся далейшага росту цэн.

„Пагоня" за далярам

ГЕЛЬСІНГФОРС, 6. Урад забараніў **вываз фінляндзкай валюты за граніцу.** Газэты паведамляюць аб узьнікшай за апошні час паніцы на валютным рынку, аб **панічным продажы фінляндзкай маркі і адначасовай пагоні за далярам,** які ўчора на чорнай біржы катываўся на 23 проц. вышэй афіцыяльнага курсу.

Міжнародны фронт рабочых-мэталюргаў

БЭРЛІН, 6. У Саарбрукіне, Саарскай вобласьці, адбылася 4-га кастрычніка **МІЖНАРОДНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ РАБОЧЫХ МЭТАЛЮРГІЧНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ,** у якой прымалі ўдзел прадстаўнікі **НЯМЕЧЧЫНЫ, ФРАНЦЫІ, БЭЛЬГІІ І ЛЮКСЭМБУРГУ.** Канфэрэнцыя абгаворвала становішча мэтапістаў у сувязі з новым наступленьнем прадпрыемцаў на зарплату. Дэлегаты асобных краін адзначылі, што зарплата рабочых мэталюргічнай прамысловасьці за апошні год скарочана на 20-30 проц. Канфэрэнцыя прыняла рэзалюцыю, у якой адзначаюцца канкрэтныя мерапрыемствы для **ПАДРЫХТОЎКІ ДА НАДЫХОДЗЯЧЫХ БОЕК** і арганізацыі масавага руху міжнароднай салідарнасьці. Выбран інтэрнацыянальны кіруючы камітэт рабочых мэталюргічнай прамысловасьці гэтых 4-х краін.

Гавань замерла

БЭРЛІН, 6. Забастоўка маракоў у Данцыгу **працягваецца. Гавань зусім замерла.** З Брэмэну паведамляюць, што там пачалася абарончая забастоўка маракоў. Маракі трох параходаў кінулі работу. У Гамбургу частковая забастоўка маракоў пашырылася. **Забастоўка адбываецца на 15 параходах.**

Панічная ўцёчка ўкладаў

СТАКГОЛЬМ, 6. У Даніі пачалося **панічнае забіраньне насельніцтвам укладаў з банкаў,** у першую чаргу з «Хандэльсбанку». Гэты буйнейшы дацкі банк з балянсам у 500 мільёнаў крон знаходзіцца, а прычыны гэтага, на краю краху. Валютная рада парляманту вынесла пастанову, паводле якое залатое забесьпячэньне дзяржбанку паніжаецца з 50 да 33 проц. Курс дзяржаўных аблігацый Скандынаўскіх краін зноў вельмі паніжаўся ў Нью-Ёрку.

Бурныя спрэчкі і бурны распад у радах с.-д.

БЭРЛІН, 6. На сходзе членаў сацыял-дэмакратычнага саюзу моладзі ў Лейпцыгу ўчора адбываліся **бурныя спрэчкі,** у часе якіх старшыня акруговага камітэту, а таксама **старшыня і намесьнік старшыні мясцовага камітэту** і 6 іншых функцыянэраў заявілі аб сваім выхадзе з сацыял-дэмакратычнага саюзу моладзі і аб пераходзе ў камсамол.

200 супроць 97

БЭРЛІН, 6. На абшчынных перавыбарах, якія адбыліся ўчора ў Мордэфэ (усходняя Прусія) сьпіс кампартыі атрымаў **200 галасоў і 6 мандатаў супроць 97** галасоў і трох мандатаў пры ранейшых выбарах.

Сутычкі паміж рабочымі і фашыстамі

БЭРЛІН, 6. Сёньня ў Эсэне адбыліся **крывавыя сутычкі паміж рэвалюцыйнымі рабочымі і нацыянал-сацыялістамі** (фашыстамі), у часе якіх **забіт адзін з мясцовых кіраўнікоў** нацыянал-сацыялістычных баявых атрадаў.

У часе пасяджэньня ангельскага парляманту, на якім стаяла пытаньне аб праекце «нацыянальнай эканомікі», у Лёндане і іншых гарадох Англіі былі арганізаваны шматтысячныя бурныя дэманстрацыі. У Лёндане, ня гледзячы на паліцэйскую забарону, дэманстранты са сьцягамі накіраваліся да парляманту. Паліцыя атакавала дэманстрантаў, у выніку чаго адбылася жорсткая сутычка.
НА ЗДЫМКУ: Паліцыя атакуе дэманстрантаў.

Новыя правакацыі Японіі
Тэрмінова фабрыкуюцца повады для інтэрвэнцыі ўнутры Кітая

Пагроза „эфэктыўнымі мерамі"

ТОКІЁ, 6. Агенцтва «Сімбун Рэнго» паведамляе, што японскі ўрад прапанаваў міністру замежных спраў Сідэхара ў ноце пратэсту на імя нанкінскага ўраду зьвярнуць увагу Нанкіну на наступныя моманты: 1) СУЧАСНЫ АНТЫЯПОНСКІ РУХ У КІТАІ РОЎНАЦЭННЫ СПРОБЕ РАЗРЫВУ ДЫПЛЁМАТЫЧНЫХ АДНОСІН ДЭ-ФАКТО, 2) нанкінскі ўрад таму павінен больш строга кантраляваць антыяпонскую агітацыю, 3) у выпадку, калі нанкінскі ўрад па-ранейшаму будзе ўхіляцца ад кантролю над антыяпонскім рухам, або будзе заахвочваць яго, японскія рэзыдэнты падпадуць вялікай пагрозе, і Японія будзе ў такім выпадку вымушана прыбегчы да ЭФЭКТЫЎНЫХ МЕР АБАРОНЫ ЯПОНСКІХ РЭЗЫДЭНТАЎ У КІТАІ.

Транспарт морскай пяхоты накіраваны ў Ханькоу

ТОКІЁ, 6.. Японскі ўрад парашыў паслаць у бліжэйшыя дні ў Шанхай транспарт «Токіва» з 400 салдатамі морскай пяхоты, матывуючы гэту пастанову ўзмацненьнем антыяпонскага байкоту. 300 салдат з Шанхаю будуць адпраўлены ў Ханькоў. Сёньня рада міністраў парашыла ў выпадку патрэбы эвакуяваць японскіх рэзыдэнтаў, якія жывуць у партох Янцзы, у Ханькоў і Шанхай.

Японскі салдафон загадвае... „шанаваць і любіць" акупантаў

ТОКІЁ, 5. Учора Хандзіо (камандуючы японскай арміяй у Манчжурыі) апублікаваў дэкларацыю, у якой пачаказвае, што «ні адна краіна ня можа весьці перагаворы з былым урадам чатырох усходніх правінцый, якому падпарадкаваны недысцыплінаваныя кіраўніцтвы войска».

У дэкларацыі гаворыцца далей, што ініцыятары руху «незалежнасьці» ў Манчжурыі, а таксама насельніцтва пажываюць японскія войскі і што няма адзнак таго, што яны жадаюць адпаўданьня старога рэжыму. Паводле сваёй дэкларацыі, японскія войскі ўстрымаюцца ад умяшаньня ў рух, адказ, «не дапусьцяць арганізацыі змовы з мэтай стварэньня палітычнай улады ў стрым Муктэне, дзе парадак падтрымліваецца японскімі войскамі». Учора ж Хандзіо апублікаваў адозву да насельніцтва, у якой і заяўляе, што «скоро манчжурскі ўрад уціскаў насельніцтва і парушаў правы Японіі». Хандзіо заклікае насельніцтва вярнуцца да штодзённых заняткаў.

Байкот японскіх тавараў ахапіў увесь Кітай

ТОКІЁ, 6. У японскіх урадавых колах паведамляюць, што байкот японскіх тавараў у Кітаі ахапіў **усё раёны Кітаю, якія знаходзяцца пад уладай нанкінскага ўраду,** прычым гэты байкот награжае ня толькі японскаму гандлю, але нават і жыцьцю і маемасьці японцаў.

Паніка ў афіцыйных кітайскіх колах

ШАНХАЙ, 6. Атрыманая нанкінскім урадам нота Японіі побач з паведамленьні аб прыбыцьці ў Шанхай **японскіх зьнішчыцеляў** і падрыхтоўкай да пасылкі ў Шанхай яшчэ аднаго **буйнога ваеннага судна** «Токіва», якое зьбіраецца высадзіць дэсант, **выклікалі тут паніку.**

Камэдыйныя фарсы —у выкананьні Нанкіну

ШАНХАЙ, 6. Тут апублікавана паведамленьне, што учора спэцыяльная камісія па замежных справах, якой даручана вырашэньне ўсіх пытаньняў замежнай палітыкі нанкінскага ўраду, парашыла прыняць прапанову Лігі Нацый **аб абароне японскіх рэзыдэнтаў,** пры ўмове, калі **японскія войскі будуць выведзены з Манчжурыі.**

Катаржныя прысуды ва ўсёй Польшчы

ВАРШАВА, 7. Кожны дзень прыносіць УСЁ НОВЫЯ І НОВЫЯ ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ І КАТАРЖНЫЯ ПРЫСУДЫ НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ РАБОЧЫМІ І СЯЛЯНАМІ.

У ЛІДЗЕ (Заходняя Беларусь) перад акруговым судом адбываўся працэс 10 абвінавачаных у прыналежнасьці да КПЗБ. Першы раз гэты працэс распачаўся ў маі 1931 году. Тады, з прычыны таго, што падсудныя ЗРАБІЛІ НА СУДЗЕ ДЭМАНСТРАЦЫЮ, ён быў адкладзен, А ПАДСУДНЫЯ ЗЬБІТЫ І ДАСТАЎЛЕНЫ НАЗАД У ТУРМУ.

На гэты раз ужо вынесен прысуд. Галоўны падсудны Д. ХОДАС ЗАСУДЖАН НА 5 ГОД КАТАРГІ, ДВА ПАДСУДНЫЯ — ПА 4 ГАДЫ, ДВА — ПА 3 ГАДЫ, АДЗІН — НА 2 ГАДЫ І АДЗІН — НА ГОД.

Працэс прыцягнуў да сябе вялікую ўвагу з боку працоўных Лідзкага павету.

Сацыял-фашысцкі «РОБОТНІК» ад 6-га кастрычніка паведамляе аб тым, што ў ВАРШАЎСКІМ АКРУГОВЫМ СУДЗЕ разглядалася СПРАВА МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ, якія абвінавачаны ў прыналежнасьці да камсамолу і ў распаўсюджаньні камуністычнай літаратуры. Засуджаны: Б. ЛЮБАРТА (17 ГОД) — НА ДВА ГАДЫ ТУРМЫ, ІТА ЛІХТЭНШТЭЙН (18 ГОД), ІТА ДУБІН (18 ГОД) І Д. ЛЕВІНСКАЯ (18 ГОД) — ПА АДНЫМ ГОДЗЕ ТУРМЫ.

У ЧЭНСТАХОВЕ засуджан НА ГОД ТУРМЫ ВУЧАНЬ ПОЛЬСКАЙ ГІМНАЗІІ М. ПЭРЭЦ. Яго абвінавачвалі ў прыналежнасьці да камсамолу, у распаўсюджаньні камуністычнай літаратуры і агітацыі.

Забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых у Грубяшоўскім павеце
(Ліст на мове эсперанта)

У **Грубяшоўскім павеце** (Польшча) памешчыца **Рулікоўская,** уласьніца двух вялікіх маёнткаў **«Старэнь» і «Рогапін»,** выціскае апошнія сокі са сваіх батракоў. Нават мізэрная зарплаты пані Рулікоўская ня выплачвае ім больш, чым па 13 месяцаў. Батракі сыстэматычна недаядаюць, працуючы штодзенна па 15-16 гадзін. Нядаўна з голаду **пакончыў самагубствам батрак Пётра Сянько. Гэты факт абурыў сялян і батракоў усяго павету.**

Даведзеныя да крайнасьці рабочыя маёнткаў пані Рулікоўскай, як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік», абвясьцілі **забастоўку.** Рабочыя салідарна змагаюцца ўжо 8 дзён. Іх барацьбу падтрымліваюць сяляне наўкольных вёсак.

Рабочыя цукраварні ў Стрыкове арганізавалі спэцыяльны камітэт дапамогі бастуючым батракам.

Рыхтавацца да 14-ай гадавіны Кастрычніка
Дырэктывы УсеЦСПС прафарганізацыям

МАСКВА, 7. УсеЦСПС прапануе правесьці даклады гаспадарча-разрахунковых брыгад у тых брыгадах, якія яшчэ не перайшлі на гаспадарчы разрахунак і папулярызаваць вопыт ударных брыгад па **зьменна-сустрэчным.** Нізавыя прафарганізацыі павінны арганізаваць кастрычніцкі паход за збор рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходстваў, правесьці праверку правільнага выкарыстаньня мэханізмаў і распрацаваць пры ўдзеле шырокіх рабочых мас і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу апэрацыйны плян па мэханізацыі важнейшых, найбольш цяжкіх вучасткаў вытворчасьці.

На рабочых сходах і на сходах калгасьнікаў неабходна абгаварыць **выкананьне ўказаньняў тав. Сталіна** аб забесьпячэньні рабсілай прамысловасьці і дэкрэту ЦВК аб льготах для адыходнікаў.

Падрыхтоўка павінна ахапіць таксама мерапрыемствы да далейшага паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Вялікая ўвага павінна быць аддана мабілізацыі рабочых мас на далейшае **ўмацаваньне абароназдольнасьці краіны.** Уся падрыхтоўка да 14-й гадавіны Кастрычніка павінна быць праведзена на аснове шырокага разгортваньня сацспаборніцтва па дасягненьні найвышэйшых паказальнікаў Кастрычніцкіх дзён.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

Выраб трактараў-цягачоў на гумовым ходзе разгортваецца на заводзе «Красный путиловец» у Ленінградзе.

Аўтаматычная тэлефонная станцыя на 900 абанэнтаў пушчана ў Смаленску. Станцыя смантыравана на 3.000 абанэнтаў.

30 мільёнаў банак кансэрваў у 1932 годзе выпусьціць Усесаюзпрамсаюз.

Чэрап з біўнямі гіганцкага слана-трагакторыя выкрыла экспэдыцыя камісіі Акадэміі Навук на беразе Волгі каля Астрахані.

Спосаб перапалу солі ў высокататунковую муку бяз усякага соевага паху знайшоў упяршыню ў Саюзе малады савецкі тэхналёг Цірковіч.

Першая ў СССР устаноўка для выкарыстаньня энергіі праменьняў сонца пушчана ленінградзкім вучоным праф. Вэйнбэргам у Канляпбэку (за 25 клм. ад Ташкенту). Устаноўка пад дзеяньнем сонечных праменьняў дае тэмпэратуры да 140 градусаў.

Вялікая колькасьць камсы зьявілася ка Чорнамерскім узьбярэжжы паміж Керчу і Анапай.

Фэнацьцін і пірамідон будуць вырабляцца ў Ленінградзе заводам «Фармакон». Да гэтага часу яны ўвозіліся з-заграніцы.

Арганізацыйнае бюро ЦК саюзу мэталюргаў арганізавана ў Кузьнецку і Магнітагорску. Да гэтага часу на пляцоўках меліся толькі камітэты пабудоўі саюзу будаўнікоў.

Плян правядзеньня „дня ўраджаю і калектывізацыі"
(14-25 кастрычніка)
Зьмест сьвяткаваньня

«Дзень ураджаю і калектывізацыі» ў бягучым годзе будзе праходзіць ва ўмовах вялізарных посьпехаў, дасягнутых у індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Пастаўленая партыяй задача калектывізаваць да пачатку 1932 г. 45 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ужо перавыканана і дасягае да «дня ўраджаю і калектывізацыі» звыш 50 проц. Звыш 10 раёнаў рэспублікі ўжо завяршаюць у асноўным суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на гэтай аснове кулацтва як клясы.

Правядзеньне «дня ўраджаю і калектывізацыі» павінна даць яшчэ большы ўздым творчай ініцыятывы, самадзейнасьці калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас пад кіраўніцтвам КП(б)Б на выкананьне далейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, на завяршэньне плянаў 3-га рашаючага году 5-цігодкі.

Асноўнай задачай і галоўнымі лёзунгамі «дня ўраджаю і калектывізацыі» павінна быць мабілізацыя мас на бальшавіцкае разгортваньне работы па арганізацыйна - гаспадарчым узмацненьні калгасаў у барацьбу за высокія якасныя паказальнікі калектыўнай гаспадаркі, за сапраўдную зьдзельчыну, ліквідацыю абязьлічкі, за своячасовае і правільнае разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю, за завяршэньне ўборачных работ і асеньняй сяўбы, за своячасовую пераапрацоўку ільну і здачу таварнай прадукцыі дзяржаве, за далейшае ўцягненьне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы, за ўзмацненьне кіруючага складу калгасаў і ачыстку іх ад кулацкіх элемэнтаў.

Асаблівае значэньне павінна быць надана выкананьню дырэктыў партыі і ўраду ад разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Галоўная ўвага ў гэтым пытаньні павінна быць сканцэнтравана на выкананьні плянаў камплектаваньня стада ў саўгасах, калгасах, на скончэньні будаўніцтва, прыстасаваньні і ўцяпленьні памяшканьняў, на арганізацыі новых таварных фэрм, забясьпечанасьці кармамі, правільнай арганізацыі працы ў жывёлагадоўлі, на здачы таварнай прадукцыі жывёлагадоўлі. А таксама барацьба за якасныя паказальнікі ў разьвіцьці тэхнічных культур і ўздым ураджайнасьці — падём цалінных зямель, поўнае выкананьне плянаў узьняцьця зябі, адбор лепшага насеньня, ачыстка яго, затаўтоўка ўгнаеньня і г д.

Максымальнае разгортваньне працы па ўзмацненьні існуючай сеткі МТС, шырокая мабілізацыя сродкаў на будаўніцтва новых і максымальнае скарыстаньне машына-трактарнага парку ў выкананьні вытворчых задач.

Прыстасаваць да «дня ўраджаю і калектывізацыі» шырокае разгортваньне агра-тэхнічнай прапаганды, правядзеньне агракультурных і зоавэтэрынарных паходаў, арганізацыю каротка-тэрміновых курсаў, пасылку на вучобу і г. д.

Пытаньне ўкараненьня агратэхнічных ведаў і аўладаньне тэхнікай рабочымі саўгасаў, калгасьнікамі, барацьбы за ўздым ураджайнасьці — трэба паставіць адным з цэнтральных пытаньняў правядзеньня «дня ўраджаю і калектывізацыі».

Адно з галоўных месц у правядзеньні сьвяткаваньня «дня ўраджаю і калектывізацыі» павінны заняць агітацыйнае ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў у галіне культ.-бытавога будаўніцтва ў саўгасах, МТС і калгасах: арганізацыя ясьлей, пляцовак, стаўлоў, клюбаў, чытальняў, выпуск насьценных газэт, радыёфікацыя, распаўсюджваньне літаратуры і г. д.

Практычнае правядзеньне „дня ўраджаю і калектывізацыі" на мясцох

1. «Дзень ураджаю і калектывізацыі» правесьці **на працягу з 14 па 25** кастрычніка.

2. Для кіраўніцтва ўсёй работай па правядзеньні кампаніі ў раёнах стварыць камісіі ў складзе прадстаўнікоў—райЗА, Калгассаюзу, МТС, РК КП(б)Б, камсамолу, прафарганізацыі.

3. Вылучыць ва ўсіх саўгасах, МТС і калгасах адказных асоб, або арганізаваць таксама камісіі, на якія ўскласьці адказнасьць за падрыхтоўку і правядзеньне «дня ўраджаю і калектывізацыі».

4. Правесьці да 10 кастрычніка ва ўсіх раёнах нарады старшынь калгасаў і сельскіх саветаў па пытаньнях практычнага правядзеньня «дня ўраджаю і калектывізацыі» ў сельскіх саветах, калгасах і вёсках.

5. Вызначыць месцы арганізацыі раённых і куставых сельска-гаспадарчых выставак, вызначыць адказных за арганізацыю выставак і правядзеньне ўсёй падрыхтоўчай работы да адчыненьня.

6. Раённыя арганізацыі, сельсаветы, саўгасы, МТС і калгасы на працягу ўсёй падрыхтоўкі і самога правядзеньня «дня ўраджаю і калектывізацыі» арганізоўваюць шырокае асьвятленьне праз сходы, друк і радыё задач калгаснага будаўніцтва, папярэдніх выпікаў працы за год, недахопаў, якія ёсьць і г. д.

7. З 10-га па 25 кастрычніка правесьці ва ўсіх саўгасах, МТС і калгасах праверку выкананьня вытворчых плянаў, праверыць правядзеньне зьдзельчыны, правільнасьць уліку працы, арганізаваць складаньне плянаў, разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю і выдачу авансаў калгасьнікам, згодна выпрацаваных імі працадзён.

На працягу паказанага пэрыяду ўсе МТС і калгасы праводзяць шырокую справаздачнасьць на сходах калгасьнікаў і аднаасобнікаў аб папярэдніх выпіках работы калгасаў увесну і ўвосень, паказаць перавагі калектыўнай працы перад аднаасобнай.

8. Сьвяткаваньне «дня ўраджаю і калектывізацыі» ў раённых цэнтрах праводзіцца з 20 па 25 кастрычніка, адчыненьне раённых выставак прыстасавань да 20-га кастрычніка з тэрмінам працы іх да 25 кастрычніка. Зьмест выставак павінен быць наступны: паказ лепшых прыкладаў арганізацыі працы ў калгасах, саўгасах, МТС, лепшых прыкладаў, барацьбы за сацыялістычную жывёлагадоўлю, лепшых прыкладаў скарыстаньня тэхнічнай базы, лепшых прыкладаў барацьбы за высокую ўраджайнасьць, лепшых прыкладаў своячасовай уборкі і пераапрацоўкі тэхкультур.

Да адчыненьня выставак прыстасаваць конкурсы і прэміраваньне саўгасаў, МТС, калгасаў, брыгад і асобных ударнікаў за лепшыя дасягненьні, за паказальную арганізацыю гаспадаркі і працы. Адначасова трэба разгарнуць масавыя экскурсіі ў лепшыя саўгасы, МТС і калгасы.

Правесьці шырокую праверку выкананьня дагавораў па сацспаборніцтве, арганізаваць заключэньне новых дагавораў.

9. На працягу з 20 па 25 кастрычніка правесьці на ўсіх раёнах шырокія сходы калгасьнікаў і аднаасобнікаў—бяднякоў і сераднякоў для абгаварэньня пытаньняў далейшых задач і напрамкаў вынікаў калгаснага будаўніцтва, разьвіцьця жывёлагадоўлі, тэхкультур.

Сьвяткаваньне «дня ўраджаю і калектывізацыі» трэба шырока выкарыстаць для ўзмацненьня непасрэднай сувязі паміж саўгасамі, калгасамі, МТС і рабочымі калектывамі прадпрыемстваў, для чого арганізаваць пасылку прадстаўнікоў арганізацыі якія шэфствуюць, на вёскі, сельска-гасп. выстаўкі, раёны, пасылку прадстаўнікоў зьлётаў саўгасаў, калгасаў і МТС на шэфствуючыя прадпрыемствы для абмену вопытам барацьбы за пасьпяховае выкананьне плянаў 3-га рашаючага году 5-цігодкі.

Правядзеньне ўсёй масавай работы ўвязаць з задачай своячасовага выкананьня чарговых гаспадарча-палітычных кампаній (збожжазагатоўкі, бульбагатоўкі, загатоўкі сырцу, сельска-гаспадарчы падатак, мабілізацыя сродкаў, рэалізацыя акцый Трактарацэнтру і г. д.), шырока выкарыстоўваючы практыку арганізацыі чырвоных абозаў, а таксама шырокае правядзеньне прыёмаў арганізаваным наборы рабочых для сацыялістычнай прамысловасьці.

10. Арганізоўваецца практычная работа па вылучэньні 300 калгасьнікаў, кіруючую працу ў раённых установах, 50 калгасьнікаў у цэнтральныя, а таксама праводзіцца перакідка 2-х тысячных калгасьнікаў на кіруючую працу ў новыя калгасы для ўзмацненьня разгортваньня працы па падрыхтоўцы кадраў у саўгасах, калгасах і МТС: чыненьне курсаў, саўгасвучаў, вечарніх школ, вярбоўка ў ВНУ, тэхнікумы, вочныя ўстановы, а таксама мерапрыемствы, якія забясьпечваюць усяднае навучаньне.

11. Праводзіцца практычная работа адборы і здачы Чырвонай арміі ў сувязі з створанага калгасамі фонду «Чырвонай арміі».

Правядзеньне сьвята «дня ўраджаю і калектывізацыі» павінна спрыяць выкананьню задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўзмацненьня калгасаў, правядзеньню сацыяльнай калектывізацыі, ліквідацыі на гэтай аснове кулацтва як клясы, рашучай барацьбы з правым апартунізмам у калгасным будаўніцтве, а таксама «левымі» загібамі.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ «ДНЯ ЎРАДЖАЮ І КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ».

Паведамленьні

— Культпроп ЦК КП(б)Б выклікае на нараду ў ЦК (пакой № 16) 9-Х 1931 г. у 10 гадз. раніцы наступных т. т. Гурскі (Галоўмастацтва); Бучукас (БДВ), Сянькевіч (Ун-т Літаратуры БАН), Наўмёнак (БРЦ) і Матусаў (БДКіно).

— ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў г. Менску 12 кастрычніка г. г. на пасяджэньні ПТ ЦКК КП(б)Б будуць разглядацца партсправы наступных т. т.: Аграпава С. Э., Даніловіча Я. М., Крэсік В. Я., Віткоўскага Б. І., Шабан М. С., Разанава А. Ф., Паўзьнера Ф. Я., Зубароўскага П. В., Страле Ю. Ул., Ланцэвіча М. Л., Назарэнка Т. А., Шафарэнак А. С., Сосьнера З. Ш., Калесьнікава Я. А., Баскакава Г. А., Калачча Б. Р., Котава М. І., Новікава М., Чыркуна Ул. А., Цмыг М. Р., Мар В. (б. Бабр. арг.), Матусевіча Макар А. М. (б. Халоп. арг.), Рас ская К. (Лагойскай арг.), Шы Я. Я., Бандарэнка С. Я., Кабаков Бушмана Ю. Ю., Аўдзеенкі І. А. кевіча М. А., Куліновіча Зьм. Н. хорчыка П. Я., Чыжык С. М. выкліканых т. т. абавязкова Зая ўцца сакратары парт'ячэек, па це якіх лічацца пералічаныя т шы.

ЧЫР В. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм **СЫН ЗОРА** у 8 ч. у гал. ролі Дуглас Фэрбэнкс
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы фільм вытворч. „Межрабпомфільм" **КАНЕЦ ДЭЗЭРЭГІНА.** Звыш прагр. „Гордасьць Трэцяга Рашаючага".
Інтэрнацыянал Адкрыт з 12 г. дня — Мастацкі фільм **ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС** Звыш прагр. хроніка
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — **ГАРЫЗОНТ 555** у 7 част. Звыш прагр. „ПРАВДА" у МАСЫ у 1 ч.
„Юны Піянэр" (Судзьбек кіно „Культура") — Мастацкі фільм **ТАРАС ТАРАСІЛА** Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 5 г. — З 1-га кастрычніка—баявік **РЭЙНСКІ БУНТАР** драма ў 7 частках.

ПРАУЛЕНЬНЕ МЦРК паведамляе, што **прыём грошай** ад валентываў на бульбу і гародніну **ПРАДОЎЖАН**
Талёны будуць выдавацца на втрыманьне бульбы і гародніны тым, якія не атрымалі па 1-й падпісцы.
Водпуск бульбы і гародніны па новай падпісцы будзе праводзіцца пасьля выдачы па 1-й падпісцы.
Парадак втрыманьня талёнаў і нормы ранейшыя: рабочым—на 4 руб., служачым на 2 руб. і ўтрымальцам, калі яны пайшчыкі, па 2 руб.

ГАБІНЭТ ТЭОРЫІ І МЭТОДЫКІ Менскага дзяржаўнага тэхнікуму фізкультуры
праводзіць рад дакладаў па **мэтодыцы фізкультурнай работы.**
Першы даклад праводзіцца **9 кастрычніка,** у 7 з пал. гадз. на тэму: **„Задачы фізкультурнага руху і новыя формы работы".**
Запрашаюцца інструктарскі склад і актыў фізкультурнікаў.
Даклад адбудзецца ў памяшканьні тэхнікуму—Савецкая, 14, 2-гі паверх.

БЕЛАХОТСАЮЗ паведамляе, што
ПАЛЯВАНЬНЕ
на **лісоў і зайцаў** у гэтым годзе пачнецца **з 20 кастрычніка.**
Праўленьне

10 кастрычніка, у 6 гадз. веч., у залі пасяджэньняў ГСПС (Пляц Волі, 23-2, былое памяшканьне Наркампрацы) склікаецца
III-ці пленум Гарпрафсавету.
ПАРАДАК ДНЯ: 1) Выкананьне прамфінпляну за 9 месяцаў і задачы IV кварталу, у разрэзе прамовы т. Сталіна. Даклады: ВСНГБ і Дзяржпляну. 2) Аб выкананьні дырэктыў партыі і ўраду па грамадзкім харчаваньні. Даклады: аддзелу грамадзкага харчаваньня і сац.-быт. сэктару ГСПС. 3) Заключныя сацдагавору са Смаленскім ГСПС. 4) Аб становішчы прафчленства. 5) Арганізацыйныя пытаньні.
Яўка ўсіх членаў пленуму, рэвіз. камісіі, добраахвотнікаў ГСПС і членаў пленуму ГарМБІТ—абавязкова.
Прэзыдыум МенГСПС.

Сёньня, 8 кастрычніка, у 7 гадз. веч., у памяшк. Гарсавету адбудзецца
пленум казэрацыйнай сэкцыі гарадзкога савету.
Яўка членаў і кандыдатаў сэкцыі абавязкова.

Да педамх членаў цэнтральнай камісіі па складаньні другой пяцігодкі.
9 кастрычніка, у 10 гадз. раніцы, у габінэце старшыні дзяржпляну адбудзецца
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ ПА ПЯЦІГОДЦЫ.
У парадку дня:
1) Вынікі праробленай працы (першыя намёткі пляну электрыфікацыі). 2) Аб рабоце сэкцыі цэнтральнай камісіі. 3) Плян далейшай работы. Прысутнасьць членаў камісіі абавязкова.
Старшыня Дзяржпляну
Старшыня Цэнтральнай Камісіі
ШКІРЛ.

СТАРА-БАРЫСАЎСКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫ ТЭХНІКУМ
абвяшчае прыём на **6-месячныя КУРСЫ** тэхнікаў-сьвінаводаў.
Пачатак заняткаў **25 кастрычніка.**
Без іспытаў прымаюцца асобы з адукацыяй не нижэй 6 клясаў сямігодкі.
Патрэбны дакументы: 1) аб становішчы, 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце, 4) аб сац. адукацыі, 5) аб здароўі. Пажадана рэкамэндацыі і накіраваньні ўкомы вучобы: усім—стыпэндыя 85 руб. і інтэрнат.
Заявы падаваць па адрасе: г. Барысаў, Стара-Барысаўскі с.-г. тэхнікум.
Дырэктар **Я. ЛЕНЬКОЎ.**

3 кастрычніка г. г., вечарам пры прагоне гурту з Бабруйску на Мантні мяса камбінат у раёне мясакамбінату (каля саўгасу Лошыца **прапала** адна карова, якая належыць Бабруйскаму мясакамбінату. Усіх, хто ведае яе месцазнаходжаньне, просьба паведаміць па адрасе: Менск, Мясакамбінат.
Бабруйскі Мясакамбінат

УКРАДЗЕНА пячатка Рабачкому № 4 саюзу будаўнікоў.
Лічыць несапраўднай

АБВЕСТКІ — 1 —
ПАВЕДАМЛЕНЬНІ ў чарговы нумар **„ЗЬВЯЗДЫ"** прымаюцца **толькі да 2-х гадз. дня.**

КУПЛЮ шафу люстравую, гарнітур мягкай мэблі, добры ложак з матр